Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛІПЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 134 (28244)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Калі самыя родныя становяцца чужымі…

У Мінску ўвялі план «Пасейдон»

СТАР. 3

Па той бок прылаўка

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:

«Магу сказаць, што ўжо 4,5 чалавека прэтэндуюць на месца ў парламенце ў гэтым папярэднім перыядзе вылучэння кандыдатаў. Аднак, думаю, колькасць ініцыятыўных груп зменшыцца, але пры гэтым павялічыцца колькасць тых, хто прыйдзе ад палітычных партый. Вылучэнне праз працоўныя калектывы — больш складаная форма вылучэння, а найбольш просты, выгадны і, у добрым сэнсе, рэкламны спосаб вылучэння — гэта, вядома, збор подпісаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2016 г.

Долар ЗША	2,0046 ▲
Еўра	2,2148 ▼
Рас. руб.	0,0313 ■
Укр. грыўня	0,0808 ▲

ISSN 1990 - 763X

Славянскі. 25-ты. Юбілейны

Сёння ўвечары адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»



Фота БЕЛТА.

Сёлета толькі ў афіцыйнай праграме каля 130 канцэртаў, шоу, спектакляў, праектаў. Фестываль №1 на постсавецкай прасторы стаў часовым і вельмі ўтульным домам для больш як 5,5 тысячы ўдзельнікаў аж з 44 краін.

КАНЦЭРТЫ З АНШЛАГАМІ

Першы сольны канцэрт у Летнім амфітэатры прайшоў пазаўчора. Пры поўным аншлагу выступіў Сяргей Лазараў. Самыя дарагія квіткі каштавалі 55 рублёў, самыя танныя — 25. Спявак прызнаўся журналістам, што ўпершыню пабываў на «базары» 20 гадоў таму — у складзе дзіцячага калектыву. І ўлюбіўся ў горад, гасціннасць і шчырасць беларусаў.

СТАР. 3

■ Правы спажыўца

БУДАЎНІКІ СЫШЛІ, А НЕПРЫЕМНАСЦІ ЗАСТАЛІСЯ

Як пазбегнуць праблем падчас рамонту?

Пачынайце рамонт... з інтэрнэту, раяць спецыялісты. Сёння тут шмат інфармацыі пра будматэрыялы і рамонтныя работы. Пры жаданні можна па відэароліках нават навучыцца тынкаваць і класці плітку. З гэтай інфармацыяй варта азнаёміцца, нават калі вы будзеце наймаць майстроў. Тым, хто хоча сэканоміць, можна паспрабаваць сябе ў ролі прараба. Лепш узяць адпачынак і кантраляваць усе віды работ. Так вы пазбегнеце многіх праблем.

УСЁ ПАД КЛЮЧ?

Сёння багата майстроў, якія прапануюць свае паслугі. На жаль, сярод «рабацяг» шмат выпадковых людзей, якія могуць на вашай кватэры «папрактыкавацца» ў рамонтнай справе. Усё ж лепей не эканоміць, тым больш, калі вам не пашанцуе з выканаўцамі і справа дойдзе да суда, наўрад ці вы зможаце нешта спагнаць з прыватніка.

Ужо некалькі гадоў цягнуцца суды, звязаныя з трохпакаёвай кватэрай у сталічнай новабудоўлі, гаспадар якой узяў на працу іпэшніка са стандартным пералікам работ, кшталту «ўсё пад ключ». Заказчык спраўна прыносіў грошы, пакуль не заўважыў, што не ўсё добра... Ён падаў у суд і выйграў. Цяпер работнік абавязаны аддаць 10 тысяч долараў, што яму былі заплачаны, плюс кошт дэмантажу і сапсаваных матэрыялаў. Як ён будзе вяртаць гэтыя грошы, ніхто не ведае. У іпэшніка няма маёмасці, і прапісаны ён у бацькоў у іншым горадзе. Кватэра стаіць сапсаваная, гаспадар не можа заняцца яе рамонтам, таму што ў любы момант могуць спатрэбіцца паўторныя экспертызы.

СТАР. 4

■ Грошы

Са спіса «дармаедаў» выкрэсліваюцца...

У Міністэрстве па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтаваны змены ў дэкрэт кіраўніка дзяржавы №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». У праекце новага дакумента, які цяпер разглядаецца ў Адміністрацыі Прэзідэнта, прапануецца вызваліць ад аплаты спецыяльнага збору маці з дзецьмі да 10 гадоў, а таксама ўладальнікаў прысядзібных участкаў, незалежна ад прапіскі. Пра гэта і іншыя нюансы аплаты новага падатку расказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб МПЗ Ірына КРЫВАРОШЧАНКА.

Мае зваротную моц

Зараз ад выплаты падатку на дармаедства вызвалены шматдзетныя маці і тыя, хто выхоўвае дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, а таксама жанчыны, якія даглядаюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Яшчэ ў снежні кіраўніцтва падатковай галіны пачало агучваць свае прапановы аб увядзенні своеасаблівай «адтэрміноўкі» на тры гады па выплаце падатку на дармаедства для хатніх гаспадынь, якія нідзе не працуюць і выхоўваюць дзяцей. Вызваліць такіх жанчын ад збору збіраліся да таго моманту, пакуль малодшаму дзіцяці не споўніцца 10 гадоў. Аб планаваным новаўвядзенні было заяўлена, але ў дакументах яно зафіксавана не было.

Разам з маці ў новым дакуменце вызваліць ад падатку на дармаедства збіраюцца і людзей, якія маюць асабістыя падсобныя гаспадаркі. «Да нас часта сталі звяртацца людзі, якія маюць зямельны ўчастак, прызначаны для абслугоўвання жылога дома. Яны працуюць на гэтай зямлі, займаюцца раслінаводствам і не разумеюць, чаму павінны быць плацельшчыкамі збору», — тлумачыць сітуацыю намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення МПЗ. Згодна з прапановай падаткавікоў, праца на падсобнай гаспадарцы будзе ўлічвацца для ўсіх катэгорый нашых грамадзян, а не толькі тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці. Таму актыўныя дачнікі, верагодна, таксама не будуць плаціць падатак.

СТАР. 2

СКАЧОК АЙЧЫННАЙ ХІРУРГІІ

Пратэзаванне трахеі з выкарыстаннем тканкаінжынернага пратэза — так называецца ўнікальная аперацыя, якую выканалі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Анатолю Хлапкову з Рагачова. Адчувае сябе пацыент добра і літаральна на наступным тыдні адпраўляецца дадому.

Фота БЕЛТА.

Беларускія медыкі першымі ў свеце дасягнулі станоўчага выніку пры выкананні падобнага аперацыйнага ўмяшання. Для гэтага давялося задзейнічаць велізарную колькасць самых розных спецыялістаў і найноўшыя тэхналогіі. Паводле слоў **дырэктара цэнтра Алега СУКОНКІ,** адной з нявырашаных праблем сучаснай медыцыны застаецца лячэнне пацыентаў з захворваннямі трахеі і галоўных бронхаў, што суправаджаецца звужэннем іх прасвету. Сустракацца гэта можа пры пухлінах лёгкага, што і мела месца ў прааперыраванага пацыента.

У свеце існуе некалькі падыходаў да пратэзавання трахеі, і кожны звязаны з высокай рызыкай развіцця ўскладненняў і гібелі. Няўдалыя спробы хірургічнага ўмяшання выконваліся ў Расіі, Іспаніі, Бельгіі, Англіі, ЗША. На думку беларускіх спецыялістаў, найбольш перспектыўным кірункам з'яўляецца выкарыстанне пратэзаў на аснове донарскай трахеі, адмытай ад клетак і заселенай уласнымі клеткамі рэцыпіента. Пры гэтым на адным з этапаў ачышчаная донарская трахея ўжыўляецца ў мышцу жывата рэцыпіента — для паляпшэння ўмоў сілкавання клетак, што імплантуюцца. Гэты этап значна паляпшае прагноз. Першы прааперыраваны менавіта такім чынам пацыент назіраецца ва ўрачоў ужо тры месяцы. Ніякіх прыкмет прагрэсавання захворвання, функцыянальнай недастатковасці ў яго няма.

Святлана БАРЫСЕНКА.

УЛАДА НА СУВЯЗІ

Традыцыйна Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 16 ліпеня «прамыя лініі» з 9.00 да 12.00.

У гэту суботу на прамой сувязі з насельніцтвам будуць:

Намеснік старшыні **БРЭСЦКАГА аблвыканкама САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч.** Тэл. 8 (016) 2213121

Намеснік старшыні **ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама АСКЕРКА Віктар Вітальевіч.** Тэл. 8 (021) 2222222

Старшыня **ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч.** Тэл. 8 (023) 2751237

Намеснік старшыні **ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч.** Тэл. 8 (015) 2735644

Намеснік старшыні **МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч.** Тэл. 8 (022) 2501869

Намеснік старшыні **МІНСКАГА аблвыканкама НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч.** Тэл. 8 (017) 5004160

Намеснік старшыні **МІНСКАГА гарвыканкама ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч.** Тэл. 8 (017) 2224444.

■ Адпачнём

ЭКАНОМІЯ — СЕМ РУБЛЁЎ У ДЗЕНЬ

На восень айчынныя санаторыі прапануюць пуцёўкі са зніжкай

Цэны на аздараўленчыя паслугі за год выраслі прыкладна на 18 працэнтаў. Калі летась дзень пражывання ў стандартным нумары санаторыя ў самы пікавы перыяд абыходзіўся ў 41 рубель (ці 410 тысяч да дэнамінацыі) на чалавека, то цяпер — у 48,5 рубля. Але на восеньскія месяцы ўжо прадугледжана сістэма зніжак. Хутчэй за ўсё цэны на гэты час упадуць да 41 рубля за суткі.

ПАПУЛЯРНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ ЛАГЕРЫ

Кошты пуцёвак у дзіцячыя аздараўленчыя лагеры аказаліся ніжэйшымі, чым прагназавалася.

— Гэта дасягнута таму, што пастаўкі тых жа прадуктаў, напрыклад, ажыццяўляюцца ад прамых вытворцаў, — патлумачыў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

Так, адправіць дзіця на 18 дзён у кругласутачны летнік абыдзецца ў сярэднім у 378 рублёў (да дэнамінацыі — 3 мільёны 780 тысяч) пры планаваным кошце ў 385 рублёў. Пуцёўка ў дзённы лагер па факце выйшла таннейшай на 20 рублёў: набыць яе можна за 84,5 рубля. На 10 рублёў паменшаў кошт знаходжання ў лагеры працы і адпачынку і склаў 90 рублёў за змену. Звяртаем увагу, што тут указаны поўныя цэны. Бацькі ж, набываючы пуцёўкі для сваіх малых, могуць разлічваць на пэўныя датацыі і ў выніку заплаціць значна меншую суму.

За першую і другую змены ў летніках аздаравіліся больш за 286 тысяч дзяцей. З іх 94 тысячы пабывалі ў кругласутачных лагерах, 192 тысячы — у дзённых. 56 тысяч дзяцей наведвалі спартыўна-аздараўленчыя лагеры, 31 тысяча — профільныя, каля 14 тысяч — лагеры працы і адпачынку. Апошнія, трэба сказаць, становяцца ўсё больш папулярнымі сярод падлеткаў.

— Лагеры працы і адпачынку дзейнічаюць ужо чацвёрты год, і іх колькасць расце, — кажа Генадзь Балбатоўскі. — Напачатку нас крытыкавалі, быццам дзяцей прымусова будуць заганяць туды працаваць. Але асцярога скептыкаў не апраўдалася. Сёння гэтая форма адпачынку вельмі запатрабавана. Падлеткі зарабляюць там грошы, набываюць навыкі. Мы нават не можам прыняць усіх ахвотных, дзеці просяцца на другую змену.

ПЯЦІЗОРКАВЫЯ САНАТОРЫІ І SPA-САЛОНЫ

Сёння айчынныя санаторыі цалкам запоўнены. І на аздараўленне туды едуць не толькі беларусы. За першае паўгоддзе ў санаторыях спыніліся больш за 95 тысяч замежнікаў (на 16 тысяч больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года). Як і раней, асноўная частка — расіяне. Іх доля хоць крыху і зменшылася, але ўсё роўна складае 80—90 працэнтаў ад усіх грамадзян іншых краін.

Разам з тым актыўней сталі прыязджаць да нас жыхары Заходняй Еўропы: палякі, немцы. Напрыклад, экспарт аздараўленчых паслуг па Гродзенскай вобласці за першае паўгоддзе вырас у тры разы.

— Брэндам беларускіх санаторыяў застаецца медыцынскі складнік. Але замежнікі заходняга рэгіёна хочуць ехаць на зразумелы для іх від паслуг — звычайна гэта SPA. Санаторна-курортныя арганізацыі сёння працуюць над развіццём гэтага рынку, і ў нас ужо ёсць паўнавартасныя сертыфікаваныя SPA-салоны, якія адпавядаць міжнародным стандартам, — адзначае Генадзь Балбатоўскі.

Клапоцяцца ў айчынных здраўніцах і пра тое, каб стварыць больш камфортныя ўмовы пражывання. Напрыклад, пры рэканструкцыі перарабляюць чатырохмесныя нумары ў адна- і двухмесныя. Летась амаль чвэрць выручкі ад рэалізацыі паслуг — каля 70 мільёнаў (700 мільярдаў недэнамінаваных рублёў) — уласнікі санаторыяў уклалі ў развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы. А каб прывычыць абслуговы персанал быць больш ветлівым, актыўна накіроўваюць пакаёвак і афіцыянтаў на курсы гасціннасці.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дзяржава і бізнес

АДЗІНЫ ПАДАТАК — ДОБРААХВОТНА

У сталіцы адбылося дзявятае пасяджэнне рабочай групы па пытаннях дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў пры грамадска-кансультацыйным (экспертным) савеце па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве эканомікі. Яно праходзіла пад старшынствам намесніка міністра эканомікі Ірыны КАСЦЕВІЧ. На пасяджэнні былі абмеркаваны практычныя пытанні, якія тычацца выплаты ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) і асаблівасцяў разліку пенсій, назначэння дапамогі ІП.

Прадстаўнікі прадпрымальніцкага асяроддзя выступілі з прапановай, якую можна назваць «не працуеш — не плаціш». Гаворка ідзе пра тое, каб прадпрымальнік — плацельшчык адзінага падатку ў выпадку, калі ён не працуе некаторы перыяд часу і не плаціць за гэты перыяд адзіны падатак, атрымліваў права выплачваць за гэты перыяд узносы ў ФСАН на добраахвотных асновах. Па выніках пасяджэння было прынята рашэнне накіраваць гэтую прапанову ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны для разгляду і вярнуцца да яе абмеркавання на рабочай групе, пасяджэнне якой запланавана на канец жніўня — пачатак верасня. Там жа дадаткова разгледзяць і агучаныя на дзявятым пасяджэнні пытанні выплаты ІП бальнічных, дапамогі, звязанай з цяжарнасцю і доглядам за дзіцем.

Таксама на пасяджэнні рабочай групы закранулі моманты, звязаныя з набыццём і эксплуатацыяй электронных ключоў. Вырашана, што гэтыя пытанні Міністэрства эканомікі пераадрасуе ўпаўнаважаным органам, а атрыманыя адказы — разашле ўдзельнікам групы.

Акрамя таго, Ірына Касцевіч паведаміла ўдзельнікам сустрэчы аб праектах нарматыўных прававых актаў, распрацоўка якіх ужо была ініцыявана групай. Так, дакумент, які памяншае меру адказнасці ІП за парушэнні тэхнічных рэгламентаў, зараз прыняты Нацыянальным сходам і накіраваны на подпіс кіраўніку дзяржавы. Што тычыцца сумеснай пастановы ўрада і Нацбанка аб парадку ўстаноўкі і выкарыстанні ІП плацежных тэрміналаў, то яна зараз дапрацоўваецца і ў найбліжэйшы час будзе ўнесена ва ўрад паўторна. Таксама Ірына Касцевіч папрасіла ўдзельнікаў групы дапамагчы скласці вычарпальны спіс формаў справаздачнасці, якія цяпер прыходзіцца прадстаўляць ІП у рамках іх узаемадзеяння з органамі ўлады.

«Мы працуем зараз над Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады, і там дакладна прапісана: скараціць усе магчымыя віды і формы справаздачнасці. Нам трэба з вашай дапамогай сур'ёзна рушыць наперад у гэтым пытанні», — заявіла намеснік міністра эканомікі.

Два наступныя пасяджэнні рабочай групы па прапанове прадпрымальнікаў вырашана прысвяціць узаемадзеянню ІП з мытнымі органамі і пытанням, якія ўзнікаюць у ходзе праверачнай дзейнасці Міністэрства па падатках і зборах.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

Са спіса «дармаедаў» выкрэсліваюцца...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер наяўнасць прысядзібнага ўчастка вызваляе ад аплаты падатку толькі жыхароў сельскіх населеных пунктаў і пасёлкаў гарадскога тыпу, патлумачылі ў міністэрстве. Механізм такога вызвалення ў старой рэдакцыі дзейнічае наступным чынам. Калі грамадзяне 183 дні і больш у каляндарным годзе будуць зарэгістраваны ў сельскім населеным пункце або пасёлку гарадскога тыпу, пры гэтым яны вядуць асабістую падсобную гаспадарку на зямельным участку, прадастаўленым менавіта для гэтых мэт, то іх прызнаюць асобамі, якія ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў. У такім выпадку абавязак па выплаце збору ў іх адсутнічае.

Ірына Крыварошчанка адзначыла, што змены ў выпадку іх прыняцця будуць распаўсюджваць сваю моц на праваадносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня 2015 года. А гэта значыць, што калі дакумент уступіць у сілу пазней, чым неабходна будзе выплаціць падатак, то можна будзе вярнуць выплачаны збор.

Астатніх падлічыць падатковая...

Сёння спецыялісты МПЗ адзначаюць, што больш за 4 тысячы беларусаў загадзя прызналіся ў сацыяльным утрыманстве, каб атрымаць 10-працэнтную зніжку на падатак. Такім людзям ужо налічылі 1 мільён 10 тысяч рублёў падатку. Самастойна гэта катэгорыя людзей магла паведаміць у падатковую інспекцыю да 31 мая аб тым, што яны нідзе не працавалі летась і не плацілі падаткаў, а аплаціць збор павінны былі не пазней за 1 ліпеня.

Цяпер падатковая служба да 1 жніўня павінна падрыхтаваць спіс тых, хто не заявіў пра сябе самастойна. Пакуль што няма нават папярэдніх ацэнак таго, колькі гэта будзе чалавек. Паводле слоў спецыяліста, да 15 ліпеня ўсе дзяржаўныя органы павінны падаць у падатковую службу інфармацыю пра беларусаў, якія ў 2015 годзе сапраўды ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржвыдаткаў. Гэта зробяць, каб выключыць работнікаў з ліку патэнцыйных плацельшчыкаў збору. Пасля гэтага спецыялісты МПЗ складуць спіс тых, хто ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржвыдаткаў летась менш за 183 дні. Потым (прыкладна ў сярэдзіне жніўня) такім утрыманцам разашлюць лісты з паведамленнем пра аплату падатку.

Падатковая прэзумпцыя невінаватасці

Спецыялісты падатковай галіны падкрэсліваюць, што не варта палохацца такога паведамлення. «Атрыманне падобнага дакумента не з'яўляецца 100-працэнтным пацвярджэннем, што трэба абавязкова плаціць падатак, — тлумачыць Ірына Крыварошчанка. — У чалавека ёсць права патлумачыць жыццёвыя абставіны, якія складваліся ў яго ў 2015 годзе. Магчыма, у інспекцыі не мелі інфармацыі пра яго ўдзел у фінансаванні дзяржвыдаткаў».

Напрыклад, падатковыя службы не маюць поўнай інфармацыі пра нашых грамадзян, якія адправіліся на заробкі ў краіны ЕАЭС, а таксама аб усіх хатніх гаспадынях, якія выхоўваюць дзяцей да 7 гадоў (да 10 гадоў, згодна з праектам). Таму гэтым катэгорыям насельніцтва наша суразмоўца рэкамендуе паведаміць пра свае заняткі ў раённую падатковую інспекцыю, каб спрасціць працу падаткавікам і не атрымаць з-за недахопу інфармацыі ад інспекцыі паведамленне на ўплату збору. Акрамя таго, калі чалавек жыў у Беларусі, але пры гэтым працаваў аддалена на замежную кампанію і заплаціў у той краіне падаткі, то трэба прад'явіць пацвярджэнне гэтай аплаты. Яна пойдзе ў залік збору, і такі чалавек утрыманцам лічыцца ўжо не будзе.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ДАВЕДКА.

Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта № 3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» вызначаецца абавязак грамадзян Беларусі, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржаўных расходаў або ўдзельнічалі ў такім фінансаванні менш за 183 каляндарныя дні ў мінулым годзе, па выплаце збору ў памеры 20 базавых велічынь. Сёння такі падатак складае 420 рублёў (4,2 млн рублёў старымі).

Сообщение о созыве очередного собрания акционеров ОАО «Проминвест»

12 августа 2016 года в 16.00

СОСТОИТСЯ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Проминвест»

по адресу: г. Минск, Логойский тракт, 31
магазин «Хозтовары-Мебель»

Повестка дня:

1. Об итогах деятельности общества за 2015 г. Утверждение годового баланса.
2. О выплате дивидендов за 2015 год и распределение прибыли.
3. Утверждение новой редакции Устава
4. Избрание выборных органов.

Начало регистрации: 15.30

УНП 100646457

ЗАСО «Промтрансинвест»
ПРЕДЛАГАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ
В ПРОЦЕДУРЕ ЗАКУПКИ № 2016-358058,
размещенной на сайте http://www.icetrade.by
АУДИТОРСКИХ УСЛУГ ПО АУДИТУ ГОДОВОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ, тел. (17) 222 75 49.

УНП 100357923

■ На слыху

РАЗГУЛ СТЫХІІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

СПІС наступстваў непагадзі, што ўсталявалася ў Беларусі на гэтым тыдні, працягвае папаўняцца. Пасля таго, як па паўночным захадзе краіны прайшлі навальніцы са смерчамі, надышла чарга іншых рэгіёнаў і сталіцы. Паваленыя дрэвы, дзясяткі пашкоджаных аўтамабіляў, затопленні на шматлікіх вуліцах — з усім гэтым сутыкнуўся Мінск 13 ліпеня.

Пакуль супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях працягвалі працаваць у Шаркаўшчынскім раёне, дзе ў панядзелак прайшла магутная бура (па рашэнні ўрада ў гэты рэгіён ужо накіраваны дадатковыя сродкі з дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву), непагадзь бушавала ў іншых месцах. Па інфармацыі МНС, у аўторак ад стыхіі пацярпелі 15 населеных пунктаў у 11 раёнах Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. Пашкоджаны дахі 78 жылых дамоў, 3 аб'екты сацкультбыту, 1 вытворчае і 38 сельскагаспадарчых збудаванняў. На шчасце, ад стыхіі ніхто не пацярпеў. Аварыйныя брыгады праводзяць аднаўленчыя работы.

Калі эпіцэнтрам катаклізму ў панядзелак стала Шаркаўшчына, то ў аўторак найбольш пацярпеў Дзяржынск. Так, на чыгуначным перагоне Негарэлае — Койданава — Фаніпаль вецер паваліў на рэйкі дрэвы. Цягнікам давялося рухацца ў абодвух кірунках па адным пуці, затрымка ў руху склала ад 8 да 55 хвілін. Увечары нармальны рух быў адноўлены. Яшчэ адно дрэва, на гэты раз у самім горадзе, упала на газаправод высокага ціску. Без забеспячэння палівам застаўся мясцовы завод лакафарбавых вырабаў, але вытворчасць не спынілася. Са 111 зафіксаваных па краіне выпадкаў падзення дрэў 95 адбылося менавіта на Дзяржыншчыне.

Не нашмат лепшай была сітуацыя і ў іншых рэгіёнах. У аварыйным парадку адключылася падстанцыя «Хойнікі-1», пакінуўшы без электраэнергіі сем населеных пунктаў і сам райцэнтр. Як паведамляе «Белэнерга», агульная колькасць абясточаных населеных пунктаў у аўторак зноў узрасла да амаль трох соцень. Раніцай серады без электраэнергіі заставалася 10 населеных пунктаў, 1 сельскагаспадарчы будынак і 34 трансфарматарныя падстанцыі на Магілёўшчыне і Міншчыне.

У сераду ж са стыхіяй сутыкнуліся жыхары сталіцы. Магутная бура і залева на некаторы час літаральна паралізавалі жыццё горада. Бачнасць на дарогах падчас навальніцы знізілася амаль да нуля. Асобныя раёны традыцыйна сутыкнуліся з падтапленнямі. Вуліцы Няміга, Гурскага, Лабанка, Каліноўскага, Кірава, Фрунзэ, праспект Ракасоўскага і многія іншыя апынуліся пад вадой. Усяго было зафіксавана каля 50 затопленых месцаў. Па інфармацыі **прэс-сакратара Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталя ДЭМБОЎСКАГА,** у горадзе быў уведзены план «Пасейдон», а на месцы падтапленняў была напраўлена тэхніка міністэрства і прадпрыемства «Гаррэмаўтадар».

Па стане на 16 гадзін 13 ліпеня ў сталіцы было павалена не менш за 100 дрэў, пашкоджаны шматлікія аўтамабілі, у некаторых дамах выбіты шыбы. Усяго ў горадзе працавала 30 машын МНС, 140 ратаўнікоў. Як мінімум адзін пацярпелы быў шпіталізаваны.

Аранжавы ўзровень небяспекі захаваецца па ўсёй тэрыторыі краіны і сёння. Удзень сіноптыкі прагназуюць пераменную воблачнасць, а ўночы — дажджы і навальніцы, у асобных раёнах град. На захадзе краіны чакаюцца моцныя залевы.

Непрыемнае здарэнне адбылося ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Быў затрыманы прылёт рэйсаў з Масквы і Амстэрдама. Самалёты авіякампаніі «Белавія», што ляцелі з Тэль-Авіва і Ларнакі, сышлі на запасны аэрапорт у Гомель. Акрамя гэтага, два судны сутыкнуліся на тэрыторыі аэрапорта, адно з іх належыць беларускаму перавозчыку. Як паведамляюць у «Белавія», у выніку інцыдэнту ахвяр і параненых няма. На сайце аэрапорта гаворыцца, што ён працуе ў штатным рэжыме, а ў выніку непагадзі ніхто з супрацоўнікаў, пасажыраў і наведнікаў не пацярпеў. Разам з тым павалены дрэвы і асобныя рэкламныя канструкцыі. У будынку аэравакзала выбіта некалькі вокнаў і дэфармавана пакрыццё столі каля іх. Праводзіцца ліквідацыя выяўленых пашкоджанняў.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Славянскі. 25-ты. Юбілейны

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

12 ліпеня ў гонар юбілею фестывалю можна было набыць квіткі на канцэрты, спектаклі і іншыя мерапрыемствы са зніжкай 25%.

Учора (13 ліпеня) у Летнім амфітэатры адбыўся сольны канцэрт Крысціны Арбакайтэ (квіткі каштавалі ад 20 да 45 рублёў). А позна вечарам — бенефіс Максіма Галкіна. У якасці спецыяльнай госці ён запрасіў Алу Пугачову. Задавальненне ўбачыць на сцэне Максіма Галкіна каштавала ад 45 да 95 рублёў...

Афіцыйны старт фэсту распачнецца ў 20.30. У Летнім амфітэатры выступяць згаданыя вышэй артысты, а таксама Надзея Бабкіна і тэатр «Руская песня», Мікалай Цыскарыдзе, Томас Андэрс (Германія), Майкл Болтан (ЗША), Уладзімір Гасцюхін, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Алена Ланская, Пётр Ялфімаў, Руслан Аляхно... Сярод замежных удзельнікаў ёсць госць нават... з Мексікі. Заўтра (15 ліпеня) у амфітэатры галаканцэрт «зорак» беларускай і расійскай эстрады «Віцебск збірае сяброў». Ён прысвечаны юбілею «базару». Выступяць уладальнікі фестывальных гран-пры даслага і дзіцячых конкурсаў розных гадоў.

Вельмі шмат вядомых артыстаў парадуюць сваім майстэрствам і на канцэрце «Саюзная дзяржава запрашае...» Ён — частка культурнага праекта фестывалю, прысвечанага саюзу Расіі і Беларусі.

У канцэртнай зале «Віцебск» адбудзецца паўфінал XXV Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. Маладыя спевакі выканаюць нацыянальныя хіты сваіх краін.

На выставе работ Юдэля ПЭНА.

Фота БЕЛТА.

ВІЗІТОЎКА ПУЦІНА І РОВАР... СВЯТАРА

Сёлета на «базары» шмат унікальных і цікавых выставак. Упершыню ў Беларусі ў Віцебскім мастацкім музеі прадстаўлены два творы Шагала: «Чорныя палюбоўнікі» і «Купанне дзіцяці». Іх прывезлі з Пскоўскага дзяржаўнага аб'яднанага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка. Каля сямі гадоў вяліся адпаведныя перагаворы. Карціны можна будзе ўбачыць да сярэдзіны жніўня. Там жа прадстаўлены работы Юдэля Пэна — настаўніка Шагала. Прыемным сюрпрызам на фестывалі стала выстава Івана Хруцкага (з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі).

У будынку ратушы — сімвале Віцебска — музейшчыкі здзіўляюць выстаўкай «З люб[ою] да Беларусі», на якой прадстаўлены падарункі ад кіраўнікоў дзяржаў і іншых афіцыйных асоб Прэзідэнту нашай краіны. Ёсць там і ўзнагароды А. Лукашэнкі за заснаванне ЕАЭС і Мытнага саюза. Уладзімір Пуцін падарыў чайны сервіз «Маскоўскі Крэмль» Імператарскага фарфоравага завода, набор памятных медалёў у гонар 200-годдзя Айчыннай вайны 1812 г. і не толькі. Побач візітоўка Пуціна, на якой няма нумароў тэлефонаў.

Геаграфія краін, чые прадстаўнікі ўручалі падарункі, вельмі шырокая: Азербайджан, В'етнам, Індыя, Інданезія, Кітай, Карэя, Пакістан, ЗША... Усе экспанаты з фондаў Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці — філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Варта ў гэтыя дні наведаць і выстаўку з Італіі «Усё жыццё ў адным ровары». Яе экспанаты пераконваюць, што ў Італіі веласіпеды ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя былі не толькі транспартным сродкам, але і перасоўнымі міні-вытворчасцямі. Калекцыянер шукаў і збіраў рарытэтныя ровары па ўсёй Італіі каля 40 гадоў! Яго калекцыя налічвае больш за 70 экспанатаў. Самаму «маладому» — 60 гадоў! Наведвальнікі ўбачаць ровар — лялечны тэатр, ровар — кінатэатр, ровар — газетны кіёск, складаны веласіпед салдата-стралка. Сярод іншых і колы слесара, кавала, краўца, пекара, малочніка, шаўца, цырульніка, камінара, лекара, святара. Ёсць і пацешны веласіпед блазна... Выстава выклікае захапленне ва ўсіх, незалежна ад узросту. Але асабліва яна падабаецца дзецям! Беларусь — першая краіна, куды вывезлі велаэкспазіцыю з Італіі. Яна пабывала ўжо ў Мінску, Гомелі. І цяпер у Віцебску.

На канцэрце Сяргея ЛАЗАРАВА.

І КАНДУКТАР ЛЯ СТАРЫХ ТРАМВАЯЎ

Недалёка ад амфітэатра (каля дырэкцыі трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення) учора рыхтаваліся прэзентаваць скульптуру кандуктара. Яна ўстаноўлена побач з адноўленымі раней рарытэтнымі трамвайнымі вагонамі. Вядома, што менавіта Віцебск стаў першым на тэрыторыі сучаснай Беларусі горадам, дзе з'явіўся электрычны транспарт. Захаваўся да нашых дзён будынак, дзе было абсталяванне для выпрацоўкі электраэнергіі. Ён стаіць літаральна насупраць амфітэатра.

Недалёка ад плошчы Перамогі днямі з'явілася стылёвая паштовая скрынка. Сёння РУП «Белпошта» запускае ў абарачэнне спецыяльны паштовы штэмпель. На ім — выява галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «базару»... У выніку з Віцебска можна адправіць лісты з фестывальным штэмпелем.

Упершыню на фэсце працуе спецыялізаваная пляцоўка «Краіна дзяцінства». Там можна ўбачыць выступы дзіцячых калектываў, навучыцца ў рамеснікаў рабіць сувеніры, весела прабавіць час на атракцыёнах. Спецыялізаваны кірмаш карыстаецца вялікай папулярнасцю.

Шмат цікавага можна ўбачыць у «Горадзе майстроў», на віцебскім «арбаце». Пра гэта «Звязда» раскажа больш падрабязна ў наступных нумарах.

Горад у гэтыя дні жыве па адмысловым фестывальным раскладзе. У прыватнасці, ноччу працуе грамадскі транспарт. Дарэчы, падчас фэсту рух на дарогах рэгулююць і... жанчыны.

Амаль што кругласутачна ў горадзе на вуліцах адбываецца нешта «базарнае»: спяваюць і танцуюць, працуюць гандлёвыя падворкі. Сумна тут не бывае. І заўсёды ёсць мерапрыемствы на любы густ.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Па той бок прылаўка

СПАТКАННЕ НА КАСЕ

На што мае права пакупнік і калі ён вінаваты?

Чалавек пражывае ў рэжыме чакання ад 2 да 6 гадоў свайго жыцця, сведчаць розныя даследаванні. Трэцяя частка гэтага часу прыпадае на чэргі: на вакзалах, у аўтамабільных заторах, крамах. Апошнія характарызуюцца асаблівым напружаннем і псаваннем нерваў сабе і навакольным. Пры гэтым часцей за ўсё спажыўцы вінавацяць у маруднасці і непрафесіяналізме касіраў. Ніхто не задумваецца, як адчуваюць сябе яны падчас 12-гадзіннай змены, калі на касе можа абслугоўвацца да 2000 чалавек.

Мая суразмоўца за 10 гадоў працы паспытала касірскага хлеба ў крамах некалькіх сеткавых рытэйлераў. Частыя аб'явы пра недахоп касіраў у такіх крамах тлумачацца жорсткай сістэмай штрафаў і пакаранняў і не вельмі прывабным сацыяльным пакетам.

«Адмена! Прынясіце ключ!»

Памятаючы правіла, што спажывец заўсёды мае рацыю, мы, на жаль, забываемся не толькі на нашы абавязкі як пакупніка, але і на элементарныя павагу і кемлівасць.

— Большасць пакупнікоў — нармальныя людзі, аднак сустракаюцца такія экземпляры, што проста жах. То кідаюць пакункі на транспартную стужку, а то ставяць прама на яе кошык і камандуюць: выкладвай, гэта твой абавязак! — расказвае Жанна. — Аднак менавіта пакупнік павінен выкласці тавар на транспарцёр, пры гэтым бутэлькі абавязкова трэба класці, а не ставіць. Я заўсёды папярэджваю пра гэта, і калі хтосьці не паслухаў і бутэлька разбілася, за яе плаціць пакупнік. Калі я не папярэдзіла — кошт разбітай бутэлькі вылічаць з мяне.

Яшчэ адзін абавязак пакупніка — аддзяляць свае пакупкі ад іншых, карыстаючыся спецыяльным раздзяляльнікам, што ляжыць на стужцы. Касір не можа ўвесь час сачыць, дзе скончыліся тавары аднаго і пачаліся пакупкі іншага. Праз гэта, дарэчы, часта і ўзнікаюць адмены на касе, калі прыходзіцца крычаць «Адмена! Нясіце ключ!» і клікаць старэйшага касіра, каб адмінусаваць з чэка лішні тавар. А гэта лішні час і нервы.

Часам прыходзіцца адмяняць цэлую гару пакупак, бо спажыўцы «не заўважаюць» надпіс «каса працуе толькі па наяўным разліку» або ў іх не хапае грошай. Здараюцца адмены і праз чыста тэхнічны момант, калі выпадкова сканер пікне два разы запар замест аднаго або касір націсне на адну лічбу двойчы.

— Ліміту на колькасць адмен за змену няма, аднак калі яны па віне касіра, а не пакупніка, гэта абыходзіцца дорага. Вось здарылася, што пакупнік бярэ 5 сыркоў, а ты незнарок прабіў 55, і ён аплацію, тады ты выплаціш за 50 лішніх сыркоў са сваёй кішэні і нават забраць іх не зможаш, — уздыхае дзяўчына. — А ёсць магазіны, дзе кіраўніцтва вырашыла не дапускаць адмен увогуле. Калі яны здараюцца, касір аплачвае суму вернутага тавару, прычым часам у 10-разовым памеры. Тавар пры гэтым застаецца ў краме.

На паліцы цана адна, на касе — іншая

Калі пакупнік прыходзіць з таварам, цана якога на касе не супадае з той, што напісана на паліцы ў аддзеле, ён можа патрабаваць разлічыць яго па ўказанай цане, а адміністрацыі крамы прыйдзецца пакрываць розніцу. Гэта здараецца, калі ведамасць з новай цаной толькі закрылі, на касу давялі, а змяніць цэннікі на зале яшчэ не паспелі. Аднак пакупнік можа ўвайсці ў становішча і заплаціць новую цану.

Здараецца, што на пэўным тавары пазначана ўвогуле іншая цана (скажам, на латок з ялавічынай наклеена этыкетка з сумай коштам свініны). Тады спажывец мае права купіць яго менавіта за ўказанную суму. У гэтым выпадку заплацяць эканамісты магазіна, якія пераблыталі лічбы.

Шмат спрэчак паміж касірамі і пакупнікамі ўзнікае і адносна акцыйных тавараў. Прыгожыя рэкламныя праспекты запрашаюць набыць прадукцыю па прывабных цэнах, а ў краме такіх найменняў часам проста не аказваецца.

— Гэта не віна магазіна, — тлумачыць Жанна. — У кожным буклеце напісана, што акцыя дзейнічае пры наяўнасці тавару на складзе. А здараецца, што пастаўшчык гэтай прадукцыі прывозіць вельмі абмежаваную партыю ў першы дзень акцыі, а пасля проста не папаўняе аб'ём. Спажывец павінен зразумець, што мы рэалізатары тавара, а не вытворцы.

Узяў — пакладзі на месца!

Сутыкненні на касе часта ўзнікаюць і праз цацкі. Маленькія пакупнікі часта перастаўляюць іх з месца на месца. А бацькі потым бяруць іх з паліцы, не звяртаючы ўвагі на тое, чаму вялізны ружовы слонік каштуе 2 рублі, і толькі на касе высвятляецца, што гэты слонік каштуе 12 рублёў, а той, што танны, — у 5 разоў меншы па памеры.

Тое ж самае тычыцца выпадкаў, калі дзіця нешта паб'е — заплаціць за рэч давядзецца бацькам. А вось калі дарослы пакупнік выпадкова зачапіў нешта сумкай ці спадніцай або яго штурхнулі і ён наляцеў на паліцы і нешта разбіў, гэта расцэньваецца як ненаўмыснае псаванне маёмасці. Выплочваць за зламанае грошы спажывец не павінен, хоць большасць крам настойвае на адваротным. І вось тут ужо трэба адстойваць правы і разбірацца.

— З іншага боку, калі прадавец «раіць» вам сачыць за малым, каб не чапаў тавар, бо ён не туды паставіў боцікі, а то «нам потым усё расстаўляць», спажывец мае права не слухаць такіх «парад». Расстаўляць рэчы па месцах пасля прымерак — абавязак прадаўца, — адзначыла мая суразмоўца.

«Вампіры», «кафейнікі», «жвачнікі»

Асаблівы кантынгент пакупнікоў — тыя, хто хоча атрымаць тавар задарма і спрабуе вынесці яго з залы. Іх па «спецыялізацыі» называюць «кафейнікамі», «жвачнікамі», «каўбаснікамі». Такія людзі бяруць на зале тавар, адрываюць штрых-код, засоўваюць рэчы ў кішэні ці пад адзенне і прама крочаць на выхад.

— Часцей за ўсё мы іх затрымліваем, бо ўжо ведаем у твар, сочым за іх паводзінамі і вядзём на агляд у спецыяльнае памяшканне, — распавяла Жанна. — Але аднойчы дзяўчына-«жвачніца» была ў краме разам са сваім хлопцам, якому, пэўна, паспела перадаць тавар, перш чым мы да яе падышлі. У знак праведнага абурэння, што мы яе падазраём, яна цалкам агалілася проста каля касы. А хлопец спакойна вынес пачак жуйкі.

Тыя, каму трэба пахмяліцца, бяруць на зале мінералку, выпіваюць яе, пераліваюць у пластык гарэлку і спрабуюць заплаціць на касе, як за мінералку. Ёсць таксама аматары паесці, пакуль ходзяць па зале. Ядуць усё. Супрацоўнікі потым знаходзяць скуркі ад каўбасы, абгорткі ад цукерак, пачкі з-пад соку і іншае.

Аднак калі дзіця будзе есці булачку ці піць сок, пакуль маці занятая пакупкамі, заўвагу яму не зробяць. Галоўнае — на касе не забыцца папярэдзіць, што трэба гэты пачастунак дадаць у квіток.

— Ёсць людзі, якія проста прыходзяць у краму «павампірыць» энергетыку. Яны нешта бубняць сабе на касе, абураюцца, а калі не вядзешся на гэта і ім не адказваеш, чуеш: «А чаму вы маўчыце? Як вы так можаце?!» Некаторыя проста адкрыта абражаюць, — успамінае касір. — А ёсць малады хлопец, які ўжо месяц штодня прыходзіць у краму, набірае поўны кошык тавараў, сярод якіх абавязкова знаходзіцца піва, прабівае на іх чэк на касе і... пакідае ўсе пакупкі ў касіра, бо спіртное яму прадаць не могуць , бо ён непаўналетні. Ён так і паабяцаў: «Я буду да вас хадзіць, пакуль вы мне не прададзіце». Дарэчы, 18 яму споўніцца літаральна праз месяц...

Такія вось атрымліваюцца «карціны з выстаўкі». Асабіста мне было вельмі цікава паглядзець на сябе збоку, слухаючы суразмоўцу. Цікава, а ці пазнае хто з вас сябе ў замалёўках партрэтаў пакупнікоў?..

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

БУДАЎНІКІ СЫШЛІ, А НЕПРЫЕМНАСЦІ ЗАСТАЛІСЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Менш чым з ААТ супрацоўнічаць па выкананні будаўнічых работ не рэкамендуецца, заўважае **эксперт па будаўніцтве Мінскага таварыства абароны спажыўцоў Алена БАРЫСЁНАК.** — У іх ёсць статутны фонд, можа быць офіс, пэўныя грошы яны ўкладаюць у сертыфікацыю, атэстацыю работнікаў. Імідж арганізацыі дорага каштуе і яго шкада губляць. Усе нясуць матэрыяльную адказнасць за няякасна выкананыя работы, і арганізацыю прасцей прымусіць да вяртання матэрыяльнага ўрону.

Калі вы заключаеце дагавор з арганізацыяй, прасіце акт выкананых работ. Ужо са штраблення сцен і закладкі электраправодкі нейкая лічба ўпісваецца ў гэты дакумент, і гаспадар ставіць подпіс, што яго ўсё задавальняе. Гэта прамежкавыя моманты прыёму якасці. **Да дагавора ў абавязковым парадку павінен быць прыкладзены каштарыс з пералікам відаў і аб'ёмаў работ.** Гэта тая папера, якая дазволіць кантраляваць працэс будаўніцтва і выдаткаваныя на яго грошы.

АПЕРАЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ ЗА ШПАЛЕРАМІ

«Танныя» майстры могуць не толькі няякасна выканаць работу, але і сапсаваць матэрыялы.

— Нядаўна ў мяне была экспертыза. Калі дарагія шпалеры (каля 700 тысяч за трубку) былі паклееныя, гаспадыня ўбачыла швы, — расказвае Алена. — Майстры часта выкарыстоўваюць для папярэдняй падрыхтоўкі сцен грунтоўку-канцэнтрат. Сам па сабе грунт вельмі добры, але калі пры яго развядзенні не прытрымлівацца неабходнай прапорцыі, і ён будзе больш канцэнтраваны, чым патрэбна, сцяна набудзе воданепрымальныя якасці. Як вынік — краі шпалераў не прыклейваюцца да сцяны. Клей падсыхае, і швы паміж палотнішчамі становяцца відавочнымі. Прычым такая праблема «вылазіць» і на бясшоўных шпалерах.

Шпалеры — рулонны матэрыял, і наяўнасць на іх швоў — норма, ні ў адным нарматыве РБ няма такога дэфекту. Але гэту праблему прасцей не дапусціць, чым выпраўляць. Трэба развесці грунтоўку ў патрэбнай прапорцыі, прамазаць месцы стыку палотнішчаў папярэдне клеем для стыкаў шпалераў, прычым не размазваць яго, а наносіць толькі па краях.

Часта майстры эканомяць час: адразу наразаюць шпалеры на ўвесь пакой, а ў выніку, калі ўсплываюць нейкія дэфекты, гаспадар не можа вярнуць грошы за няякасны матэрыял. Магазін вяртае толькі адну трубку. Ён можа накіраваць свайго тэхнічнага спецыяліста ці выклікаць незалежную экспертызу, каб высветліць, адкуль пачаўся дэфект і колькі шпалераў можна было захаваць, і выступіць з сустрэчным іскам аб парушэнні аперацыйнага кантролю. Добры майстар спачатку прыклейвае толькі тры палотнішчы і раіцца з гаспадаром, ці задавальняе яго такі варыянт. У ідэале яму лепш узяць пісьмовую згоду ў кліента. Калі выконваецца аперацыйны кантроль, дэфекты адразу бачныя, фінансавыя страты і гаспадара, і выканаўцы, і магазіна мінімальныя.

МАЙСТРЫ-ШКОДНІКІ

Дэфекты дзвярэй і вокнаў, менавіта не заводскія, а тыя, што ўзніклі пры выкананні работ па іх устаноўцы, усплываюць даволі часта. Як правіла, мантажнікі не маюць дачынення да арганізацый, якія непасрэдна вырабляюць матэрыялы. **Каб падстрахавацца, трэба ўказваць у дагаворы, які тычыцца матэрыялаў, што ўбудоўваюцца, пункт «мантаж».**

Алена Барысёнак расказала пра майстра, які сапсаваў 6 якасных шпаніраваных дзвярэй у трохпакаёўцы: паабдзіраў шпон, пазаляпваў мантажнай пенай, якую з яе немагчыма ачысціць. Арганізацыя пайшла з кліентам на міравое пагадненне і замяніла

дзверы, але, каб дайшло да суда, наўрад ці яна панесла б выдаткі.

— У маёй практыцы быў выпадак, калі арганізацыя ўзялася рабіць фундамент. Натуральна, работы выконваліся летам, а да зімы яна ўжо з усіх сіл судзілася з заказчыкам, — расказвае эксперт. — Работнікі праігнаравалі ўсе нормы, якія неабходна ўлічваць пры забудове фундаментаў. У іх не было на яго праекта. І пры ўсім гэтым арганізацыя не мела сертыфіката на забудову фундамента. Праз суд з яе спагналі 55 мільёнаў на старыя грошы, якія ім заплаціў гаспадар, стапрацэнтны штраф на карысць дзяржавы, выдаткі на дэмантаж фундамента і на вядзенне судовага працэсу. У выніку 55 мільёнаў выраслі да 170.

Ёсць шэраг будаўнічых работ, для выканання якіх неабходна наяўнасць сертыфікатаў (іх пералік можна знайсці на сайце «Будтэхнорма»). Без наяўнасці ў юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка сертыфіката на канкрэтны від работы ён не мае права аказваць гэту паслугу. Напрыклад, абавязковыя сертыфікаты на мантаж вокнаў, дзвярэй, сантэхніку, каналізацыю, унутраную і знешнюю разводку. Іх, як правіла, афармляюць арганізацыі, іпэшнікі гэтага не робяць, таму што гэта даволі дарагая справа (адзін сертыфікат каштуе каля 300 долараў). А іх на розныя віды работ арганізацыі трэба мець мінімум 10—12. Акрамя таго, атрымаць такі дакумент вельмі складана. Трэба пацвердзіць якасць работ, якія арганізацыя можа выконваць, даць магчымасць доступу спецыялістам арганізацыі, якая займаецца сертыфікацыяй, на свае аб'екты. Важна мець і неабходнае абсталяванне.

Калі вы давяраеце работнікам закупляць будматэрыялы, сачыце за тым, каб з вас не ўзялі лішніх грошай і не закупілі непатрэбнага. Часам работнікі заяўляюць, што для аддзелкі сцен пакоя пайшло столькі тынкоўкі, колькі б хапіла на дзве кватэры. Калі фірма закупляла матэрыялы, любы чалавек можа пралічыць выдаткі на іх і выкрыць, калі яго падманулі. **Толькі трэба на ўсе матэрыялы адразу патрабаваць чэкі.**

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Прымаем работу

- Калі прымаеце новабудоўлю, рабіце кантроль на кожным этапе. Глядзіце на роўнасць сцен, столі. Ёсць нормы допуску. Так, для атынкавання існуюць тры віды якасці, ад простага да палепшанага. Калі эксперт правярае якасць, прыкладае ўзровень і глядзіць на колькасць адхіленняў. Калі заяўлена высакаякаснае тынкавальнае пакрыццё, а яно яўна не дацягвае нават да простага, можна патрабаваць перарабіць альбо суразмерна паменшыць кошт выкананых работ.

- У кожнага забудоўшчыка свае «балячкі». У аднаго могуць быць праблемы са столямі ва ўсіх кватэрах. Напрыклад, эксперт агледзела пяць кватэр, у іх была розная вышыня столі і розніца дасягала трох сантыметраў. Была забудова на вуліцы Бяды, дзе ўсе вокны на сонечным баку пакруцілa «вінтом», гэтаму ёсць тлумачэнне — тут сэканомілі на тэндары на зашкленне. Таму пры выбары забудоўшчыка ў інтэрнэце глядзіце, на што скардзяцца людзі, і звярніце ўвагу на гэта ў абраным доме.

- Усе праблемы, звязаныя з мантажом вокнаў, усплываюць у першую ж зіму. У гэтай пары года ёсць вельмі халодны тыдзень, калі за акном мінус 20, і менавіта ў гэты час гаспадар бачыць, што вокны пачынаюць пацець, на іх назапашваецца кандэнсат. А самы жахлівы выпадак у практыцы Алены Барысёнак, калі вада з акна патокам лілася на падаконнік, а пасля на падлогу. На падобныя выпадкі ёсць гарантыйнае абавязацельства арганізацыі аб рамонце, замене ці пераўстаноўцы.

- Многія нюансы чалавек можа паглядзець сам. Напрыклад, праверыць якасць сцяжкі без спецыяльных інструментаў. Гаспадыням трэба надзець шпількі і пахадзіць па падлозе. Так, Алена Барысёнак расказвае, як хадзіла па сцяжцы, а абцасы правальваліся. Адразу зразумела — украдзены цэмент, застаўся адзін пясок, бачна, дзе трэба перарабляць.

Сямейная газета

Выпуск № 13 (56)

Воблака прэтэнзій

— Ну, як там твая дачка?

— Бы сыр у масле качаецца. Кожныя тры месяцы муж на мора возіць, штогод новае футра купляе...

— А сын?

— А вось сын — так сабе. Жонка яму не вельмі трапілася. То ёй на мора трэба, то футра новае патрабуе...

Жарты жартамі, але са свякрухамі ды цешчамі шанцуе не ўсім... Не пашанцавала і маёй знаёмай. «Свякроў празмерна нас апякае, лезе ўсюды, усё імкнецца кантраляваць, — жаліцца яна. — Пакуль не было дзіцяці, дык яшчэ нічога. Жывём жа, дзякуй Богу, у розных гарадах. Але вось калі нарадзілася дачушка, мама мужа прыехала да нас пагасціць на месяц, каб мне дапамагчы. Але ж навошта мне такая дапамога! Яна ж літаральна выдзірае з рук немаўля: «Ты не так купаеш, не так корміш, не так выхоўваеш». Я моўчкі трываю ўсе прэтэнзіі і штодзень плачу ў падушку... За ўвесь год, што прайшоў пасля вяселля, столькі не плакала, колькі з яе прыездам. Ды і з мужам адносіны пагоршыліся. Яго як падмянілі. Пастаянна раздражнёны. Лічу дні да таго моманту, калі яна з'едзе...»

Памятаю, як я — студэнтка-першакурсніца — таксама штораз, калі прыязджала на выхадныя праведаць бацькоў, рыдала. А ўсё з-за таго, што маме не падабалася, як я апраналася. Ніколі не забудуся, як мы паехалі на кірмаш па зімовую куртку. Прахадзілі там па холадзе не адну гадзіну, перамералі тысячу абновак. Але мне так нічога і не спадабалася. У выніку я вярталася дадому ўся заплаканая ў ярка-чырвонай куртцы з залацістымі гузікамі. Мама, відаць, была задаволена пакупкай, але я так больш ні разу яе і не апранула. Яна ж пра гэта не ведала, таму па-ранейшаму набывала мне розныя рэчы і перадавала ў Мінск. Пакуль я не зразумела, што так больш працягвацца не можа. У мяне свае густы. У мамы свае. Таму, калі я чарговы раз прыехала дадому, і мы зноў пасварыліся, прапанавала ёй пагаварыць шчыра. Я сказала, што цаню яе клопат. Але, разам з тым, папрасіла паважаць і мой выбар. У той вечар мы абняліся, паплакалі разам. І цяпер, калі мама хоча мяне парадаваць, то дае грошы, маўляў «купі сабе тое, што спадабаецца». Часам, вельмі рэдка, яна па інерцыі пачынае заводзіць размову пра «класічны касцюмчык» і «туфлі на абцасіку». На што я аджартоўваюся, маўляў, давай табе лепш усё гэта купім. І мама тут жа з усмешкай успамінае маю просьбу і спыняецца...

Тое ж самае я параіла зрабіць і сваёй знаёмай. Сесці і проста пагаварыць з мамай мужа адкрыта. Хто ведае, можа, пасля шчырай размовы яны стануць лепшымі сяброўкамі? А такія прыклады ёсць. Ведаю адну паспяховую жанчыну, кіраўніцу. Яна, нягледзячы на тое, што развялася з мужам, працягвае сябраваць з яго маці. Яны разам ходзяць у кіно, па пакупкі... Давяраюць адна адной свае самыя патаемныя сакрэты. «Як такое можа быць?» — дзіўлюся. — «Яна проста паважае маё рашэнне, а не папракае, не вінаваціць. Дазваляе мне заставацца самой сабой. А гэта ў наш час такая рэдкасць».

Нейкі час я наймала кватэру разам з сяброўкай і яе мужам. Алег чамусьці пастаянна рабіў мне заўвагі, таму асацыяваўся ў мяне з «воблакам прэтэнзій». Я спачатку спрабавала апраўдацца, паспрачацца, адказвала на заўвагу заўвагай. Але потым змяніла тактыку. На чарговую заўвагу: «Вось, пасля зімы ў маім ровары пашкодзіўся правадок, гэта, пэўна, ты неакуратна яго перастаўляла, як мыла падлогу... Пастарайся наступным разам рабіць усё акуратней». — «Гэта ж зразумела. Я заўсёды з рэчамі, тым больш чужымі, абыходжуся ахайна», — сказала я спакойна ў адказ. Алег прамаўчаў. Было відаць, што ён ніяк не чакаў такога адказу. А праз хвіліну зайшоў у пакой і выбачыўся, маўляў, «можа, гэта я сам зачапіў і не прыкмеціў».

Бацькоў, як сваіх, так і мужа, мы не выбіраем. Але ж мы вольныя выбіраць рэакцыю на тое, што адбываецца. І гэта адзінае, што ў нас ніхто не можа адняць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Тыя, хто побач

ТАТА Ў ДЭКРЭЦЕ

Фота Надзеі БУЖАН.

У нашай краіне ўсяго толькі 1% татаў карыстаюцца законным правам пайсці ў адпачынак па доглядзе дзіцяці. З іх ліку і бас-гітарыст гурта J:МОРС Валерый ДАСЮКЕВІЧ. Музыкант запрасіў нас дадому, дзе за кавай і ў перапынку паміж гульнёй з сынам падзяліўся сваім амаль трохгадовым досведам «вусатага няня».

«Мама ж у нас — дырэктар»

Пакуль тата заварваў каву, Макар паспеў пазнаёміць нас са сваім беласнежным катом Багзам, паказаць «БМВ» з пультам кіравання і драўляную чыгунку з цягнікамі...

— Макарчык, вазьмі трубачку, мама нешта хоча табе сказаць, — даносіцца з кухні голас таты і хлопчык тут жа забываецца на нас ды на свае цацкі.

— Чыё гэта было рашэнне — афарміць водпуск па доглядзе дзіцяці? — цікаўлюся ў Валерыя, пакуль Макар размаўляе па тэлефоне.

— Агульнае. Усе цудоўна разумелі, што Іра не зможа сядзець у дэкрэце. Мама ж у нас — дырэктар, праўда Макар? *(падміргвае сыну)*. Знайсці ёй замену на тры гады не так проста. Калі сын нарадзіўся, яна на 30 дзён узяла адпачынак. А пасля я прыняў удар на сябе *(смяецца)*. Я ж на завод не хаджу. Рэпетыцыі ды канцэрты ў мяне, як правіла, па вечарах, выхадных і святочных днях, калі мама дома. Мы з Ірай шмат ездзім па свеце і бачым, што за мяжой мужчыны прымаюць непасрэдны ўдзел у выхаванні дзяцей. А я чым горшы? У мяне сяброў шмат такіх жа. Такія ўжо таты, да мозгу касцей.

— Не было вам страшна заставацца з маленькім сам-насам?

— Не. Наадварот, было вельмі цікава. Столькі ўсяго новага для сябе адкрыў. Мы ж яго нарадзілі не ў 18 гадоў. Мне было 32. Таму я падышоў да бацькоўства свядома. Цудоўна разумеў, што будзе цяжкавата спачатку. Бяссонныя ночы, першыя зубкі, паліклінікі... Нам пашанцавала з бабуляй: Ірына мама вельмі дапамагае. І нянечка заўсёды на падхваце. У мяне ж дзень на дзень не прыходзіцца. Часам даводзіцца і пасярод тыдня на гастролі з'ехаць.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Увага! Новы фотаконкурс!

БЕЛАРУСІКІ

Шаноўныя, мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у новым конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а мо нават і праўнукаў (з невялічкім (4-5 сказаў) аповедам пра фота) на адрас «Звязды» з пазнакай «Сямейная газета. Беларусікі». Але адна ўмова — каб зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаецца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз.

А распачаць рубрыку мы вырашылі здымкамі аўтара нашай пастаяннай рубрыкі «Нататкі таткі» Аляксандра Алесіка. «Трэці год напярэдадні Купалля мы фатаграфуем нашу Васілісу з валошкавым вянком. Нават не магу сказаць, як узнікла гэта ідэя. Хацелася зрабіць нешта такое, што не проста б фіксавала на памяць моманты дзяцінства дачушкі, але і было сімвалічным, звязаным з нашай культурай. Усё неяк само склалася ў адно цэлае: Васіліса — валошкі — вянок — Купалле... Вось так нарадзілася наша прыгожая сямейная традыцыя, якая, спадзяюся, абавязкова будзе працягвацца».

■ Ёсць пытанне

ЦІ БРАЦЬ МУЖА Ў РАДЗІЛЬНЮ?

Калі я абмовілася пра тэму, на якую збіраюся пісаць, муж паморшчыўся: «Узялі моду мужыкоў на роды цягаць. Не наша гэта справа». Я паспрабавала была прывесці довады «за», але ён толькі адмахнуўся. І сапраўды, роды заўсёды лічыліся чыста жаночай справай, і мужчыны мала праяўлялі да гэтага цікавасці. Яшчэ гадоў дзесяць таму нават выраз «партнёрскія роды» гучаў чужародна, а з'ява была даволі рэдкая. Сёння прысутнасць мужчыны ў радзільнай зале не выклікае здзіўлення, хоць пытанне наконт гэтай неабходнасці застаецца адкрытым. Адны жанчыны лічаць, што нельга траўмаваць мужчыну, другія настойваюць, што муж павінен на свае вочы ўбачыць, як нялёгка даюцца дзеці. Вопытам сумесных родаў падзяліліся маладыя бацькі Таццяна і Уладзімір РОЛЕВЫ.

Паўгода таму ў сям'і Уладзіміра і Таццяны з'явіўся доўгачаканы сыночак. Даведаўшыся пра цяжарнасць, яны адразу вырашылі, што будуць «нараджаць разам». «Я не хадзіла вакол мужа з угаворамі, — успамінае Таццяна. — На сваю прапанову пачула адразу: «Добра, я пайду з табой!» Але мы ўсё ж дамовіліся, што калі Валодзя падчас родаў раптам захоча выйсці, то ён можа гэта зрабіць. Але ў яго такога жадання не ўзнікла».

Сёння Тані здаецца, што яна не справілася б без падтрымкі мужа. Яна нават не магла ўявіць, што будзе так балюча... «Абязбольвальныя прэпараты на мой арганізм не падзейнічалі. І страшна ўявіць, што я магла на 5 гадзін застацца сам-насам з гэтымі пакутамі. Муж вельмі падтрымліваў, дапамагаў. Мяне ўвесь час мучыла смага, і ён мачыў мне вусны сурвэткай. Я сціскала яму рукі ад болю, а ён усё спакойна трываў, падбадзёрваў. Трэба валодаць неверагодна моцнымі нервамі, каб назіраць боль дарагога чалавека. Не кожны зможа гэта вытрываць. Я крыху разгубілася, усё, чаму вучылася на курсах, на імгненне вылецела з галавы. Муж нагадваў, як трэба правільна дыхаць. Гэта такое шчасце, што ён быў са мной побач!»

Уладзімір застаўся з Таняй і калі пачаліся роды. А ўзяўшы на рукі свайго нованароджанага сыночка, зразумеў, што ўсе выпрабаванні вартыя гэтага шчаслівага моманту. «Я адчуваю да мужа неверагоднае пачуццё падзякі, — дзеліцца Таццяна. — Ён мне таксама дзякаваў пасля родаў за магчымасць убачыць, як з'явілася на свет наша дзіця. Пасля таго дня мы яшчэ больш з'ядналіся, сталі раднейшымі адно аднаму.Упэўнена, што і на другія роды мы абавязкова пайшлі б разам».

* * *

Ці бяспечныя партнёрскія роды для сямейных адносін? Пра гэта і іншае мы пагутарылі з акушэрам-гінеколагам 5-й мінскай клінічнай бальніцы, кіраўніком «Сямейнай акадэміі здароўя» Дзіянай МАРДАС.

— Курсы па падрыхтоўцы да нараджэння малога карыстаюцца вялікім попытам, і будучыя таты на іх зусім не рэдкія госці. На занятках паводзяць сябе нават больш актыўна, чым мамы: задаюць пытанні, удакладняюць, канспектуюць. У «Сямейнай акадэміі здароўя» мы праводзім фотасесіі на занятках. Вельмі кранальна, калі тата раздрукоўвае здымкі, каб захаваць у альбоме ўспаміны пра тое, як ён рыхтаваўся да гэтай доўгачаканай падзеі. Пасля сумеснага навучання ў будучых бацькоў з'яўляецца ўпэўненасць, што яны з усім справяцца. Жанчына пазірае на мужа з павагай і гонарам.

Што тычыцца курса «Партнёрскія роды», то ён праводзіцца ў многіх радзільнях. Для тых, хто плануе нараджаць з партнёрам, гэтая падрыхтоўка абавязковая. У дзень «ікс» пары прыязджаюць разам. Дарэчы, кожны тыдзень у нашым раддоме адбываюцца мінімум адны партнёрскія роды, бывае і 2—3.

Курсы па падрыхтоўцы да нараджэння малога карыстаюцца вялікім попытам, і будучыя таты на іх зусім не рэдкія госці. На занятках паводзяць сябе нават больш актыўна, чым мамы: задаюць пытанні, удакладняюць, канспектуюць.

— Ці варта ўгаворваць мужа, калі ён не згаджаецца ісці разам?

— Ні ў якім разе. Гэтае рашэнне трэба прымаць удваіх. Растлумачце мужу, чаму вы хочаце, каб ён прысутнічаў. Калі ён згодны — выдатна, калі не, лепш пакіньце гэтую ідэю. Зусім нармальна не жадаць парных родаў. Бывае так, што мужчына настойвае, а жанчына супраць. Паўтараю, павінна быць толькі агульнае жаданне.

— Чым рэальна можа дапамагчы мужчына ў родах?

— Перш за ўсё ён кантралюе сітуацыю, падлічвае схваткі. Сочыць, каб жанчына правільна дыхала, робіць ёй расслабляльны масаж, аблягчае болевыя адчуванні з дапамогай спецыяльных рэлаксуючых тэхнік. Усяму гэтаму пары навучаюцца на курсах. І, натуральна, маральная падтрымка ад роднага чалавека для жанчыны ў родах асабліва важная.

— Ці заўсёды мужчына прысутнічае ў радзільнай зале?

— Партнёрскія роды могуць праходзіць па двух сцэнарыях. Першы — калі муж знаходзіцца толькі ў перадродавай. Першага крыку немаўляці ён чакае пад дзвярыма. Неўзабаве тату дазваляюць зайсці і ўзяць малога на рукі. Гэты варыянт найбольш распаўсюджаны.

Другі варыянт — гэта прысутнасць і ў радзільнай зале ў тым ліку. Але мужчына падчас родаў знаходзіцца за галавой жанчыны. Бывае, што татам у гэтым выпадку нават даводзіцца перарэзаць пупавіну.

— Ці могуць партнёрскія роды адбіцца негатыўна на сямейных адносінах?

— Гэта можа здарыцца толькі ў тым выпадку, калі хто-небудзь з партнёраў першапачаткова быў не гатовы. Так, напрыклад, жанчына спадзявалася на падтрымку мужа, а ён ад убачанага разгубіўся, нават прытомнасць страціў. Яна пачынае за яго хвалявацца, што ў такой сітуацыі ёй на шкоду. Праз гэта жанчына можа расчаравацца ў партнёры, маўляў, не апраўдаў надзеі. Плюс сам працэс родаў можа выклікаць у маральна непадрыхтаванага мужчыны непрыемныя адчуванні, надоўга запомніцца і выклікаць дрэнныя ўспаміны ў далейшым. Таму, калі жанчына ведае аб моцнай уражлівасці свайго мужа або яна не ўпэўнена ў яго вытрымцы, лепш не рызыкаваць. Не той выпадак, калі можна праводзіць эксперыменты.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ

■

■ Паміж намі, мамачкамі

ЗАСТРАХАВАЦЬ ЦЯЖАРНАСЦЬ

Малому Таццяны Гірынай нядаўна споўнілася чатыры месяцы. Для 27-гадовай выкладчыцы па танцах і фітнесе гэта доўгачаканае дзіця, таму яна сур'ёзна паставілася да цяжарнасці і падрыхтавалася «на выдатна». Жанчына нават паспела зазірнуць у страхавую кампанію, каб на ўсялякі выпадак «перастрахавацца». Так, вам не падалося, сучасны спектр паслуг настолькі велізарны, што будучая маці мае магчымасць абараніць не толькі сябе, але і яшчэ не народжанае дзіця.

«Пра паслугу «застрахаваць цяжарнасць» я даведалася выпадкова, — прызнаецца маладая маці. — Я бавіла час на розных форумах у пошуках належнай радзільні. Тады і натрапіла на цікавыя выпадкі, калі жанчыны шляхам страхавання вырашалі абараніць сваё здароўе і жыццё дзетак. Я застрахавала цяжарнасць і роды ў верасні мінулага года, калі была дзесьці на пятнацатым тыдні. Кампанія прапаноўвала розныя па працягласці і кошце віды страхавання. Я вырашыла засцерагчы сябе і дзіця на год, аднак дамову пры неабходнасці можна працягваць. Такім чынам, калі з маім дзіцем здарыцца што-небудзь нядобрае да верасня, то яно атрымае матэрыяльную кампенсацыю».

У пакет паслуг уваходзілі такія выпадкі, як таксікозы на позніх тэрмінах, памылкі ўрачоў, разрывы пры родах — тое, з чым можа сутыкнуцца кожная жанчына.

Паслугай «рэпрадуктыўнае страхаванне» можа скарыстацца кожная жанчына ва ўзросце да 50 гадоў, калі тэрмін цяжарнасці не перавышае 20 тыдняў. Таксама існуе варыянт страхавання «Гінекалогія», які гарантуе матэрыяльную падтрымку жанчыне (неабавязкова цяжарнай) ва ўзросце да 55 гадоў падчас выяўлення паталогіі, якая можа прывесці да негатыўных наступстваў: аперацый, інваліднасці або смерці.

«Па праўдзе кажучы, я ніколькі не пашкадавала, што застрахавала сябе і дзіця, — дзеліцца Таццяна. — Я заўважыла вельмі асцярожнае стаўленне медперсаналу да сябе. Акрамя гэтага, мне рабілі экстраннае кесарава, нягледзячы на тое, што цяжарнасць працякала спакойна. У выніку я без праблем атрымала грошы па страхоўцы. Таксама ў пакет паслуг уваходзілі такія выпадкі, як таксікозы на позніх тэрмінах, памылкі ўрачоў, разрывы пры родах — тое, з чым можа сутыкнуцца кожная жанчына».

«Рэпрадуктыўнае страхаванне для жанчын — гэта даволі спецыфічная паслуга. Мы імкнёмся абараніць не толькі жанчыну, але і яшчэ не народжанае дзіця, — тлумачыць Людміла Кулак. — Страхавыя выпадкі бываюць зусім рознымі. Дзеці нараджаюцца з родавымі траўмамі, інваліднасцямі, прыроджанымі парокамі. Ёсць варыянты страхавання толькі ў адносінах да жанчыны, у адносінах да жанчыны і дзіцяці і нават у адносінах да маці і некалькіх дзяцей, калі гэта шматплодная цяжарнасць».

Крок за крокам: што патрэбна, каб застрахаваць сябе і сваё дзіця:

1. Пракансультавацца ў спецыяліста страхавой кампаніі, каб даведацца пра магчымыя пакеты паслуг і выбраць найбольш прыдатны.
2. Узяць даведку з жаночай кансультацыі з указаннем тэрміну цяжарнасці і стану здароўя на момант страхавання.
3. Звярнуцца ў офіс страхавога прадпрыемства з пашпартам і даведкай для падпісання дамовы.
4. У страхавым выпадку неабходна прадставіць у страхавую кампанію абменную карту з раддома з адпаведным дыягназам, пашпарт і дамову.
5. Напісаць заяву ў офісе кампаніі.
6. Пачакаць 10 дзён, пакуль ідзе праверка, і атрымаць ліст ад кампаніі.
7. Атрымаць грошы па адрасе банка, азначаным у лісце.

Пра што шэпчуцца будучыя мамы (вытрымкі з форумаў):

Leno4ka

«Дзяўчаты, існуе такое страхаванне, звязанае з цяжарнасцю і родамі. Хто страхаваўся, адгукніцеся. У мяне такой страхоўкі не было: даведалася пра яе, калі паклалі на захаванне. У нашай палаце дзяўчына ляжала са страхоўкай. Вось гэта абслугоўванне... На працягу дня медсёстры зазіралі з пытаннем «Як самаадчуванне?», усіх аглядалі з выкарыстаннем бальнічных прылад, у яе выпадку выкарыстоўвалі аднаразовыя, у чарзе па ўколы гэтая дзяўчына не стаяла, іх рабілі ёй у палаце... Гэта і сапраўды «захаванне», хоць бы ад стрэсу.»

олеч_ка

«Па праўдзе кажучы, я не разумею, як страхоўка можа паўплываць на стаўленне ўрачоў да цяжарнай жанчыны. Страхаванне — гэта дамова паміж страхавой кампаніяй і чалавекам. Страхавая арганізацыя прапаноўвае свае паслугі, вы плаціце грошы і ў пэўным выпадку атрымліваеце кампенсацыю. Роля медустановы зводзіцца да правільнага выяўлення дыягназу і запісу яго ў эпікрыз. А хто-небудзь ведае, ад чаго страхуюць?»

Leno4ka

«Гэта могуць быць разрывы пахвіны, ампутацыя маткі, спантанны аборт, заўчасныя роды, позні таксікоз цяжкай ступені, дыябет (калі ён узнік падчас цяжарнасці), ускладненыя роды, мёртванараджэнне, родавыя траўмы дзіцяці і многае іншае. Поўны пералік можна знайсці на сайце Белдзяржстраха.»

Tani_K

«Як толькі пра страхоўку даведалася, адразу пайшла па даведку. Напярэдадні патэлефанавала ў Белдзяржстрах і атрымала падрабязную кансультацыю. Іду на гэта, каб дактароў трымаць у тонусе. Шчыра спадзяюся, што не наступіць страхавы выпадак. Яшчэ агент сказала, што страхоўку можа аформіць кожны паўналетні член сям'і замест цяжарнай. Так што, татачкі, дзейнічайце!»

Даведка

У кампаніі «Белдзяржстрах» зарэгістравана 626 выпадкаў рэпрадуктыўнага страхавання (на 1 ліпеня 2016 года).

Кошт страхавога паліса на страхавую суму 1000$ складае каля 90$ на год страхавання. Гэтыя лічбы вар'іруюцца ў залежнасці ад умоў і падвідаў страхавання. Мінімальная выплата ў страхавым выпадку — 110$, максімальная — 1000$ (у памерах страхавой сумы).

«Суму, на якую хочаш застрахаваць цяжарнасць і роды, можна абраць самому, — працягвае Таццяна. — У нас гэта была 1 000 $. Дарэчы, максімальная сума, якую кампанія гарантавала выплаціць нам у непрадказальнай сітуацыі. У залежнасці ад абранай сумы страхоўкі спецыялісты вылічваюць пэўны працэнт, які патрэбна заплаціць. У маім выпадку страхоўка каштавала 180 беларускіх рублёў. Грошы можна было заплаціць на працягу трох месяцаў».

Вераніка УЛАСЕВІЧ.
veronika.ulasevich@mail.ru

■

Ужо склалася добрая традыцыя, калі чытачы «Звязды» дзеляцца забаўнымі гісторыямі са свайго жыцця. Але сёння, шаноўныя, мы хочам вас запрасіць да іншай размовы. «Сямейная газета» прапануе новы праект, дзе можна падзяліцца набалелым, распавесці пра тое, як вы пераадолелі складанасці, атрымаць ці даць параду, а можа, і адкрыць свой сакрэт шчасця. З нецярпеннем чакаем вашых лістоў!

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ: ЧУЖЫЯ ЛЮДЗІ?

Чаму блізкія людзі могуць гадамі не гаварыць адзін з адным? Чаму дарослыя дзеці сядзяць на шыі ў бацькоў? Адкуль бяруцца адзінокія старыя і чаму так вырасла колькасць сацыяльных сірот? Героі, чые аповеды мы змяшчаем, папрасілі толькі аб адным: не называць прозвішчаў. Яны шукаюць парады, хаця калі задумацца над іх словамі, можна заўважыць, што адказы на многія пытанні яны ўжо знайшлі.

Яны мяне не бачаць...

«Калі селішся ў невялікім горадзе, тваё жыццё як на далоні. Мне заўсёды сорамна глядзець людзям у вочы. Я разумею, што ніхто мяне ні ў чым не вінаваціць. Але мне сорамна за лёс маіх дзяцей, за тое, што я не магу імі пахваліцца, не ўпэўнены ў тым, што калі-небудзь нешта наладзіцца ў іх жыцці.

Мне сорамна за лёс маіх дзяцей, за тое, што я не магу імі пахваліцца, не ўпэўнены ў тым, што калі-небудзь нешта наладзіцца ў іх жыцці.

Сын ажаніўся, але дзяцей заводзіць не хоча. Час ад часу ён уладкоўваецца на работу, спускае ўсё, што зарабіў, а пасля заходзіць да мяне пазычыць грошай.

Здароўе мне ўжо не дазваляе працаваць. Жыву на пенсію. Ды не адзін, з дачкой, якой за сорак. Паступова мы знішчаем тое, што з жонкай запасілі ўсё жыццё. Прадалі машыну — праелі, пасля кватэру змянілі на меншую, а за розніцу жывём. Я абнасіўся, хаджу ў дзіравых ботах. І на дапамогу дзяцей не спадзяюся. Ужо гадоў з дзесяць дачка нідзе не працуе. Можа да 12 праляжаць у ложку, пасля выпіць кавы і знікнуць да вечара. Добра, калі павітаецца, а часцей пройдзе і не заўважыць мяне. Я баюся думаць пра заўтрашні дзень. Не ведаю, ці дапаможа хто-небудзь, калі мне стане кепска. Мне ўжо 74. Ніхто не спытае пра маё здароўе. Я прыбіраю ў доме, гатую ежу. Калі не вазьмуся за венік, пыл можа пакрыць увесь дом. Вяртаюся з дачы — разбіраю брудны посуд, што сабраўся за тыдзень. Я звыкся з тым, што я адзін. Але не пакідаюць шкадаванне і страх. Што будзе з маімі дарослымі дзецьмі, калі мяне не стане?

Я спрабую разабрацца, у чым мая віна. У тым, што не змог выхаваць? Ці ў тым, што не змог скроіць жыццё дзяцей? Мне цяжка ад таго, што я ім як чужы. Я не магу перакінуцца з імі хоць парай слоў. Яны мяне не бачаць. Не чуюць. Не заўважаюць. Я побач, я спрабую клапаціцца пра іх. Можа, гэта адзінае, што мяне зараз трымае: я спрабую змагацца за іх жыццё, як умею. Гатую і прыбіраюся, каб паказаць, што я не здаўся. Што я не хачу апускацца, і што не хачу, каб яны «забілі» на сябе. Я ўсё спадзяюся, што яны зменяцца. Што таксама пачнуць змагацца за сябе: спачатку за свой быт, пасля дабрабыт, а пасля і шчасце.

Я спрабую зразумець, калі ўсё пайшло не так... З жонкай жылі душа ў душу. Многа працавалі, мелі дастатак. Дзеці былі паслухмяныя, вучыліся добра. Праўда, дачка расла хваравітай, часта ў бальніцах ляжала. Мы яе шкадавалі, песцілі, заўсёды стараліся дапамагчы, падтрымаць, нават калі яна вырасла. Жонка брала на сябе ўсе яе праблемы: выбірала навучальную ўстанову, уладкоўвала на працу, ездзіла па бальніцах, нават разбіралася з кавалерамі, з якімі ў дачкі не склалася. Можа, мы яе занадта апекавалі? А можа, мы проста не ўмелі любіць дзяцей?»

Васіль Іванавіч.

Нас ніколі не абдымалі...

«Яшчэ з маленства мы можам адчуць, што нешта не так, але асэнсаваць і зразумець, у чым бяда, атрымаецца толькі, калі пасталеем. Неяк падчас навагодняга застолля пры сварцы з бацькамі брат гаркнуў: «Аддайце ўсё любімай дачцэ!» І я зразумела многае. Чаму ён калаціў мяне, калі мы былі малымі, чаму ён рос такім злым, чаму пачаў выпіваць...

Ён заўсёды думаў, што яго ніхто не любіць. Вось толькі памыляўся, што любяць мяне. Я пакутавала таксама, як ён, і мне не хапала любові. Нас ніколі не абдымалі. Бацькі нават папракалі іншых дарослых, калі бачылі, як тыя мілуюць сваіх дзяцей: «Што за соплі». Нас ніколі не хвалілі. Больш за тое — мы раслі на папроках. Чулі, што самі нікчэмныя, і нашы сябры такія ж, усё, што мы робім — дрэнна. Толькі я сціскала зубы і маўчала, а брат агрызаўся, бунтаваў. Можа, таму, што на яго сварыліся больш, ён быў упэўнены, што мяне любяць. Мы раслі. Ён пайшоў у вучылішча, а бацькі плацілі за маю вышэйшую адукацыю. Ён працаваў на будоўлі, а родныя збіралі грошы на маё вяселле. Ён ведаў, што калі б не піў і збіраўся ажаніцца, бацькі б таксама фінансава яму дапамаглі. Але калі адчуваеш сябе адзінокім, прасцей думаць, што бацькоўская ўвага дасталася камусьці іншаму. А я ўпотайкі плакала, што мая маці не выбірае са мной вясельную сукенку і наогул не цікавіцца падрыхтоўкай да свята...

Сёння бацькі і брата ўжо няма. Засталіся толькі я і маці. Але ці ёсць мы адна ў адной? І ці былі? Я расла без яе клопату і любові. Бацькі стараліся здабыць неабходнае, каб было не горш, як у людзей. Маці думала, што догляд за дзецьмі — гэта адстаяць у чарзе і купіць зялёныя бананы, дэфіцытныя джынсы, як у суседскіх малых. А я і брат раслі самі па сабе, ніхто не правяраў нашых урокаў, не гуляў з намі на вуліцы, не прыдумляў для нас свят. Я зайздросціла сваім аднакласніцам, у якіх маці былі за лепшых сябровак. Мне не было з кім пасакрэтнічаць і проста падзяліцца сваімі дасягненнямі. Маці нават не ведала, калі я здавала школьныя экзамены і дзе знаходзіцца ВНУ, якую я скончыла.

Калі старэйшы сын у паўтара года хварэў на пнеўманію, наша бабуля нават не патэлефанавала, не спытала пра яго здароўе...

Днямі, калі гуляла з каляскай, разгаварылася з жанчынай, якая ў гэты ж час выкаціла на прагулку свайго ўнука. Размаўлялі пра тое, як растуць немаўляты, што ўжо ўмеюць, як мы з імі займаемся, чым кормім, дзе набываем рэчы. Здавалася, жанчына ведае пра кожны рух свайго ўнука. Малы прачнуўся, і мая суразмоўца павезла яго дахаты. А я далей каціла каляску, хуталася ў шалік і збочвала ад мінакоў, каб яны не бачылі маіх мокрых вачэй. Я зноў адчула адзіноту. Мне балюча, што мае дзеці растуць без бабулі. Яна з'яўляецца па вялікіх святах, дорыць цукеркі і грошы малым, мы з дзецьмі перыядычна яе наведваем, робім кантрольныя званкі. І яна, і я стараемся браць адпачынкі так, каб праводзіць іх на лецішчы разам. Але я не бачу ні цікавасці, ні ўвагі, ні любові да малых. Ніхто ніколі не сачыў за іх першымі крокамі, словамі, адкрыццямі, не радаваўся, выбіраючы ім падарункі, не хадзіў на дзіцячыя ранішнікі, не перажываў за адзнакі ў школе. Калі старэйшы сын у паўтара года хварэў на пнеўманію, наша бабуля нават не патэлефанавала, не спытала пра яго здароўе...

Я спрабую з гэтым змірыцца і прыняць. Мне вельмі шкада маці, што яна не можа радавацца таму, чаму радуюцца іншыя бабулі. Што яна закрываецца, аддае сябе на адзіноту. Але я ўсё гэтак жа адчуваю сябе чужой побач з ёю. Я хачу выплакацца і шчыра пагаварыць з ёй, але не магу. Як быццам магчымасць нешта змяніць была страчана. Калісьці. Даўно...»

Ірына.

Падрыхтавала
Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

■ Вазьму твой боль...

КАЛІ ЛЮБІШ — АДПУСЦІ

Апошнім часам у мяне часта пытаюцца пра любоў. Якая яна і ў чым праяўляецца? Як адрозніць і пазнаць? Раней я наіўна думала, што гэта адзіная тэма, у якой я разбіраюся. А цяпер не магу адказаць ні на адно з пытанняў. Я ўжо не адрозніваю любоў ад кахання, не распазнаю пачуцці, не магу апісаць іх і вызначыць словамі.

Але ёсць адна ідэя і мерка, якой я карыстаюся. Гэтую падказку, як і большасць сваіх урокаў жыцця, я атрымала ў Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.

Дзядзька Паша любіў, калі я прыходзіла ў палату да яго сына Алёшы. Хлопец станавіўся весялейшым, час праходзіў хутчэй, і думкі пра хваробу адступалі. Яны заўсёды частавалі мяне гарбатай, напіхвалі гасцінцы з сабой у сумку.

А мне трэба было абысці некалькі палат, у якіх кожны раз чакалі майго прыходу, як вольнага паветра. І да кожнага заходзіш — быццам толькі яму належыш. У мяне ніколі не паварочваўся язык сказаць, што пара збірацца да іншага пацыента, што ў суседняй палаце таксама чакаюць. І часам да суседняй палаты я дабіралася толькі праз некалькі гадзін.

Я заўсёды побач, але кожны дзень адпускаю яго ад сябе. Бо хачу, каб яму было добра.

І вось баўлю час з Наташай, а ў дзверы ўваходзіць Лёха і коратка кідае: «Зайдзі да нас хутчэй, там бацька нешта хоча ад цябе». Аказваецца, яны ведалі, што я ўжо прыйшла і цярпліва чакалі свайго часу. А мне, як на ліха, у той дзень яго надта бракавала. «Наташ, я вярнуся, абавязкова вярнуся, толькі даведаюся, што патрэбна дзядзьку Паўлу», — абяцаю я, сама не ведаючы, як паспець.

— Вось, сядай, я свежанькага баршчу зварыў, — з парога мне працягвае лыжку дзядзька Паша.

— Баюся, што не змагу сёння правесці час з Алёшам, — шчыра прызнаюся, агаломшаная такім паваротам. — Я там з Наташай... і на работу палячу.

— Ну і добра, ляці сабе. Толькі паеш спачатку, інакш з палаты не выпушчу.

Ён ведаў, што я іншагародняя студэнтка, якая сумяшчае вучобу з працай і валанцёрствам, і што паклапаціцца пра мяне няма каму. І вось гэтая шчырасць прэтэнзій і чаканняў, непатрабавальнасць і жаданне аддаць без узаемнасці абяззброілі мяне. Я сёрбала баршч, прымасціўшыся на бальнічным ложку каля тумбачкі, і ніяк не магла праглынуць камяк у горле. Ён проста хацеў паклапаціцца і адпусціць мяне ў суседнюю палату да Наташы. І гэта асэнсаванне стала для мяне сімвалам сапраўднай любові.

Мой любы сябар плануе пераезд у іншую краіну. Толькі ўяўлю, як мне будзе не хапаць яго, адразу слёзы наварочваюцца. Ён разумее мяне, як ніхто. Мы жывём па адных канонах, аднолькава бачым і адчуваем, разумеем тое, што нельга сказаць словамі. Мы вельмі падобныя. І я не ведаю, ці сустрэну ў жыцці яшчэ такога блізкага чалавека. Але радуюся за яго ад'езд. Бо ведаю, чаго яму не хапае тут, і ўпэўненая, што там ён зможа стаць сабой. Любоў перамагае эгаізм. Мне важней, каб ён быў шчаслівым, чым каб быў са мной побач.

Я часта адпускала тых, каго люблю. Менавіта таму і адпускала, што люблю. Калі ім трэба было сысці, калі так было лепш для іх, я перагрызала сваё нясцерпнае жаданне быць разам і адпускала. Мне важна ведаць, што яны ёсць і што ім добра. Я назіраю здалёк і радуюся іх радасцям. Вяртаюся ў любы момант, калі ім патрэбна дапамога. З'яўляюся без крыўды і нараканняў. З'яўляюся толькі таму, што па-ранейшаму люблю.

Я выхоўваю трохгадовага сына як абсалютна адасобленага ад мяне чалавека. Не бачу яго часткай сябе. Не лічу, што яго жыццё належыць мне. Гэта маё глыбокае перакананне: ён самастойны з самага першага дня. Не навязваю яму свае меркаванні і даю магчымасць выбіраць. Я спадзяюся з радасцю выпусціць яго ў дарослае жыццё, ніколі не раўнаваць да нявесткі і не трымаць каля матчынай спадніцы. Я заўсёды побач, але кожны дзень адпускаю яго ад сябе. Бо хачу, каб яму было добра.

Я настолькі паважаю волю дарагога чалавека, так цаню яго жаданне і выбар, што перастаю думаць пра свае жаданні. Я вельмі хачу быць шчаслівай разам. Але яшчэ больш хачу шчасця ім. Здаецца, гэта і завецца любоўю.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху
«Клуб 5000»

■

ТАТА Ў ДЭКРЭЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Не ведаю, ці змагла б я даверыць сваё дзіця чужому чалавеку... А як вы выбіралі нянечку?

— Таня нам ужо як свая. Знайшлі яе па рэкамендацыі маіх сяброў. У яе ўласныя дзеці ўжо дарослыя — музыканты. Сама ж яна ўсё жыццё прысвяціла педагогіцы, працавала дырэктарам школы. Яны з Макарам неяк адразу знайшлі агульную мову.

— А жонка не пакутуе, што магла б больш часу з сынам праводзіць?

— Ёсць, канешне, крыху. Але яна «адрываецца» ў адпачынку, па выхадных. Па вечарах у мяне часта то трэніроўка (па тайскім боксе. — **Аўт.**), то рэпетыцыя. Дык яны ўдваіх тусуюцца, без мяне. І вельмі ў іх усё добра. Плюс мама заўсёды прыходзіць у абед, каб пабыць з Макарчыкам крыху.

«Я з квактухамі нават размаўляць доўга не магу»

— Некаторыя лічаць, што жанчына павінна сядзець дома ды варыць баршчы...

— О не! Я з квактухамі нават размаўляць доўга не магу. Не буду ж я з імі гаварыць пра боршч пастаянна. Са школы, з музычнага вучылішча мяне акалялі цікавыя, творчыя людзі. Квактух сярод іх не было. Ніводнай. І жонка ў мяне пастаянна развіваецца, ходзіць на розныя курсы, чытае запоем. Яна скончыла ліцэй БДУ, пасля мехмат БДУ, бізнес-школу ІПМ, абаранялася ў Польшчы.

— Побач з такой жанчынай таксама нельга стаяць на месцы...

— Менавіта так. Таму мы і рухаемся разам: Іра штосьці даведалася новае, штосьці я, дзелімся сваімі набыткамі, цягнемся адно за адным. Для мяне самае важнае, што нам цікава разам. З квактухамі ж проста: імі можна камандаваць, прыгнятаць. З разумнай жанчынай такі нумар не пройдзе. Але некаторым мужчынам так прасцей: за кошт гэтых «хатніх» жанчын нешта з сябе ўяўляць, самарэалізоўвацца...

— А як вы пазнаёміліся?

— На юбілейным канцэрце Apple Tea. Ужо сем гадоў прайшло, як мы разам.

— Вас з'яднала любоў да музыкі?

— Не, хутчэй аднолькавыя погляды на жыццё. У размове я тады адразу зразумеў, што ў нас шмат агульнага. А яшчэ мы абое вельмі любім падарожнічаць.

— Як правіла, вандруеце ўдваіх?

— Не, цяпер учатырох. З 4 месяцаў паціху пачалі ўцягваць і Макара. Бабулю таксама бяром з сабой. І нам прасцей, і ёй таксама добра. Палову дня мы з Макарам гуляем. А пасля аддаём Ірынай маці, бяром матацыкл напракат і паехалі катацца. Макар жа яшчэ маленькі, яму трэба паспаць абавязкова днём.

Лічу, што добра, калі ў садзіку ёсць хоць адзін забіяка, каб іншыя дзеці разумелі, як з гэтым жыць.

— У мяне ёсць знаёмы, які прынцыпова адпачывае адзін ці ў мужчынскай кампаніі. Расказваў, як аднойчы ўзяў з сабой жонку на байдаркі, дык яна ўжо праз дзень пачала даймаць размовамі накшталт «як мы будзем дом будаваць?»

— Іра вельмі шмат працуе, вырашае свае сур'ёзныя задачы ў бізнесе. Яна не можа прыйсці пасля работы і пераключыць адразу ж увагу. Гадзін да дзесяці толькі адыходзіць. Адзіны спосаб ёй «перазагрузіць» мозг, гэта паехаць у адпачынак на тыдзень-два. Таму ні пра якую работу, ні пра якія праблемы мы з ёй там не гаворым.

— Як у вашай сям'і размяркоўваюцца абавязкі?

— Я стараюся Іру па-максімуме разгрузіць. У магазін езджу, люблю гатаваць. У мяне такі талент, ад бацькі, напэўна. Жонцы гэта нецікава. Адразу, калі пачалі сустракацца, Іра сказала: «Слухай, я не люблю гатаваць». Для мяне гэта не праблема. Неяк, яшчэ да знаёмства з Ірай, мы ехалі са знаёмым у камандзіроўку. «Ой, я забыўся ўзяць ссабойку», — кажу я. — «А ты што, яе сам збіраеш?» — «Ну, так». «А што, твая дзяўчына не збірае?» — «Не». — «А навошта яна такая наогул патрэбная?» А сэнс жа не ў тым, каб каханая табе ссабойкі збірала і штаны мыла. Я заўсёды быў самастойны, самадастатковы ў гэтым плане. З 17 гадоў жыву адзін, усё раблю за сябе сам. Зараз, праўда, штосьці і Іра за мяне робіць. У прыватнасці, за мыццё бялізны яна адказвае.

«Сын забараняе мне іграць на гітары»

— Як звычайна бавіце час з сынам?

— Я яго ў басейн важу. Гэта мой самы прыемны абавязак.

— Шмат там татаў з дзецьмі?

— Апошнім часам так. Прычым майго ўзросту. Відаць, што яны прыходзяць туды не таму, што трэба, а таму, што гэта ім падабаецца. Мне, напрыклад, з Макарам у «жабніку» забаўна. Сам я там, вядома, не змагу нармальна паплаваць. Але вы б бачылі, як мы дурэем з ім, скачам, ныраем. Любім мы ездзіць разам і на рыбалку. Праўда, сынок, любіш ты рыбу лавіць, вудачкай сіняй? У мяне шмат розных, але ён чамусьці заўсёды просіць сінюю. У нас з Ірай заўсёды была дыскусія. Яна кажа, што не хоча, каб Макарчык вырастаў так хутка. А я, наадварот. Ну што мне з той лялечкі? Іра, бабуля і Насця (Ірына дачка ад першага шлюбу) расчульваюцца: «усі-пусі». А мне што з таго? Я люблю, каб сын хадзіў са мной некуды. Спрабую браць на работу. Але пакуль толькі ў студыю. Бо апошні раз, калі мы прывялі дзяцей на рэпетыцыю, закончылася тым, што яе давялося перапыніць. Яны ж не даюць нічога рабіць: па барабанах ляпаюць, шнуры выдзіраюць.

За спінай дзіцяці, перакананы, павінны стаяць продкі па мужчынскай лініі — бацька, дзед, прадзед, якіх ты паважаеш. Вельмі дрэнна, калі гэтыя сувязі разарваныя.

— Бачыце ў ім музыку?

— Пакуль не. Ён любіць пастукаць па барабанах ды пакрычаць, як і ўсе дзеці ў яго ўзросце. А вось спяваць не. І мне забараняе. На гітары іграць таксама. Штосьці яму не падабаецца. Я бяру гітару. А ён: «Тата, не. Не трэба». Вось пальчатку баксёрскую маю надзець — гэта яму больш даспадобы. Узрост такі, характар пачынае праяўляцца. Макар у нас вельмі камунікабельны. Вельмі хоча ў садзік. Вырашылі, што аддадзім у тры гады.

— Не баіцеся, што нечаму дрэннаму навучыцца ў іншых дзяцей?

— Нічога страшнага. Хлопец усё ж такі. Трэба ж імунітэт выпрацоўваць. У мяне ёсць сябар, які дачку вадзіў у прыватны дзіцячы сад. Там усе дзеці былі, як на падбор — выхаваныя, спакойныя. Калі пераехалі жыць у іншы канец горада, стала далёка вазіць, таму аддалі ў бліжэйшы сад. У першы ж дзень дзяўчынку давялі да істэрыкі. Але затое ёй пасля стала прасцей ісці ў школу. Лічу, што добра, калі ў садзіку ёсць хоць адзін забіяка, каб іншыя дзеці разумелі, як з гэтым жыць.

— Як, дарэчы, складваюцца адносіны з Ірынай дачкой?

— Я для яе сябар, «чувак», да якога яна добра ставіцца. Насця цяпер у такім узросце, калі хочацца тусіць, часта ездзіць на розныя канцэрты. Мне нешта паказвае, пытаецца, раіцца. Я ж «сяку» ў тэме *(смяецца)*.

— Татам яна вас не называе?

— Не. У яе добрыя адносіны са сваім татам. Калі ён у яе пытаўся пра мяне, Насця сказала: «Гэта вельмі добры чувак». Ёй тады было гадоў 11. Цяпер жа яна ўжо вучыцца ў інстытуце.

«Нельга «баніць» дзіця»

— Як вы ставіце да адкрытага праяўлення эмоцый? Часта кажаце Макару, што вы яго любіце?

— У маёй сям'і эмоцый практычна не было. Мама яшчэ больш-менш. А вось бацька наогул сваіх пачуццяў ніяк не праяўляў. Я ж лічу, што калі хочацца, трэба, абавязкова праяўляць. Каб дзіця адчувала, што яго любяць. Калі Макару штосьці не падабаецца, ён жа ў сабе гэта не трымае. Нельга стрымлівацца, бо гэта пасля вылезе вельмі моцна бокам. Штосьці не падабаецца — скажы. Штосьці падабаецца — пакажы. Трэба ўсе свае адчуванні пражываць. Гэта вельмі важна. Я гэта ўжо ведаю, таму Макар расце ў іншым асяродку.

(Макар дастаў каробку і высыпаў усе пазлы на падлогу).

— Вось так мы любім рабіць *(смяецца Валерый)*. Ну давай цяпер разам будзем збіраць...

— Якіх прынцапаў прытрымліваецеся ў выхаванні?

— Я — савецкае дзіця. Хто там глядзеў, што я адчуваю, чаго я хачу? «Не хадзі, не лезь» — вось гэта я чуў пастаянна. Памятаю, калі мне было 10 гадоў, захацеў пайсці на ушу. Сказаў пра гэта маме. «Ты што, не хадзі! Галаву адаб'юць там, не дай бог, зубы павыбіваюць». Я рос са страхам унутры, з кучай комплексаў... У нас такога няма і не будзе. Мы Макару нічога не забараняем. Не крычым на яго. Калі шчыра, у мяне па першым часе таксама вырывалася па інерцыі «нельга», але я сябе спыняў пастаянна. Што б Макар ні зрабіў, я заўсёды яго хвалю. Таму што калі ты яго хваліш, ён расце ўпэўненым, не зацюканым.

— У маці і таты пэўна, розны падыходы да выхавання. Як вы супакойваеце сына, калі ён плача?

— Іра кажа: «Хочаш плакаць, паплач. Яшчэ мацней». Ён: «Не, не буду». А я проста адцягваю ўвагу, пераключаю на нешта іншае, больш цікавае. Тое ж самае і з планшэтам. Як яму забараніць ім карыстацца? Нельга забараняць, трэба проста паказаць іншыя магчымасці. Вось споўніцца яму 5 гадоў, абавязкова аддам на бокс. Па-першае, ён будзе заняты. Па другое, у чалавека, які займаецца спортам, не важна якім, з дзяцінства выпрацоўваецца характар. Нешта баліць, не хачу, лянота, але трэба. У арміі са мной служыў чэмпіён рэспублікі па веславанні. Я зразумеў, што спорт даў яму, акрамя шырокіх плячэй, спакой і ўпэўненасць у сабе. Акрамя бокса, прапануем яму нейкія развіваючыя гурткі. Каб не было вольнага часу ў планшэт «тупіць» ды па падвалах лазіць.

— Знаёмы даў свой першы верш тату пачытаць, а ён пачаў смяяцца: «Ты Ясеніна лепш пачытай...»

— Нельга так казаць, ні ў якім разе — гэта сур'ёзная траўма. Мае бацькі не хацелі, каб я музыкай займаўся. Я сам пайшоў у музычную школу, адзін. Папрасіўся, каб мяне ўзялі. Тое ж было і з музычным вучылішчам. Здаў іспыт і паступіў. Мае бацькі — простыя людзі, хацелі, каб я быў майстрам-тэхнолагам, займаўся вытворчасцю каўбас, пячэння, макаронаў. Каб я заўсёды быў пры ежы. Казалі: *«Валера, ну зачэм табе ўся гэтая музыка?»* Я ж нікога не слухаў.

— Вы не слухалі, а нехта б мог паслухаць і пасля пашкадаваць...

— Усе мае школьныя сябры слухалі. Ну і цяпер... Я не ведаю, чым яны займаюцца. Таксама было і ў музычным вучылішчы. Большасць музыкай не займаюцца. Проста нехта палічыў, што ім трэба туды пайсці, і не важна, хацелася ім, ці не. Гэта адразу было бачна. Таму нельга ні ў якім разе так «баніць» дзіця.

— Як вы лічыце, калі жанчына выхоўвае сына адна, з'яўляецца пагроза, што гэта будзе чарговы распешчаны «мамчын сынок»?

— Многія рэчы здольны даць толькі тата. Ніхто ніколі яго не заменіць. Плюс у хлопчыкаў, якіх тата альбо недалюбіў, альбо быў жорсткім, альбо наогул яго не было, вельмі шмат комплексаў. За спінай дзіцяці, перакананы, павінны стаяць продкі па мужчынскай лініі — бацька, дзед, прадзед, якіх ты паважаеш. Ты павінен адчуваць, што ты не адзін. Вельмі дрэнна, калі гэтыя сувязі разарваныя.

— Усе, хто супраць, каб бацька сядзеў у дэкрэце, аргументуюць сваё меркаванне тым, што да трох гадоў дзіцяці абавязкова патрэбна мама, а не тата?

— Маці канешне патрэбна, бо ў іх сувязь асобая, нават на фізіялагічным узроўні. Менавіта таму ў жыцці Макарчыка Іры не менш, чым мяне. Гэта ж не тое, што я сеў у дэкрэце і сяджу. Я ж паспяваю і грошы зарабляць. Часам а трэцяй гадзіне ночы пасля карпаратыву вяртаўся. А Іра сыходзіць на работу ў 9 раніцы. 3-4 гадзіны паспаў і «гуляй тата». Павінны быць і мама, і тата, на аднолькавых ролях. Я не разумею, як дзяўчаты нараджаюць і пасля гадуюць дзіця ў адзіноце. Гэта ж можна звар'яцець. Я бачу такіх адзінокіх матуль (прычым, у многіх з іх ёсць муж, але ён ці выпівае, ці ігнаруе і не дапамагае). «Гора-тата» не разумее (ці не хоча разумець), што адбываецца. А гэтую няшчасную маці адразу бачна. У яе такі погляд — ніякі, яна перастае сачыць за сабой, бо няма калі гэтым займацца. Вось табе і сядзіць маці ў дэкрэце да трох гадоў. І які сэнс? Каб была маці, трэба, каб быў і тата.

P.S. *З мамай Макара нам усё ж такі таксама пашцасціла пазнаёміцца. У 13.08 з ліфта, які мы выклікалі, выйшла Ірына (пазналі па фотаздымках, што бачылі на сценах кватэры). Яна вельмі спяшалася на абед, каб пабыць крыху з сынам.*

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
dryla@zviazda.by

Фота Надзеі БУЖАН.

СКРЫПЕНЬ: І ЕЖА, І НАПОЙ

У народзе скрыпень завуць «ласіным чаем» — бо яго парасткамі не супраць паласавацца ласі, алені, зайцы. З яго сцяблін рабілі вяроўкі, таму і звалі «дзікім ільном». Але ўсё ж больш вядомая нам гэтая расліна, як «іван-чай». З яе лісткоў і кветак у сялян атрымліваўся духмяны напой. Між іншым, паступова ён вяртаецца — сёння засушаны скрыпень можна набыць у магазінах ці на кірмашах. Але, калі гэта расліна расце побач з вашымі ўчасткамі, чаму не нарыхтаваць яе самім? І цяпер самы час! Зазірніце ў зараснікі, усыпаныя яркімі кветачкамі, шарганіце рукой уздоўж сцябліны — у ёй застанецца жменя лістоў.

Між іншым, каб у вас атрымаўся духмяны напой, мала проста сабраць лісточкі і засушыць. Заварыце такія і толькі абурыцеся — трава травой. Па старадаўняй тэхналогіі такі чай павінен «выспець», ці як цяпер кажуць, прайсці ферментацыю. А для гэтага кожны лісток трэба расцерці паміж далонямі, каб ён скруціўся ў трубачку. Каб сэканоміць час, я расціраю адразу некалькі лісткоў, а некаторыя людзі наогул прапускаюць іх цераз мясарубку. Масу, што пусціла сок, кладзем у слоік, прыкрываем і даем пастаяць суткі, не болей, ператрымаеце — закісне, чай з яе будзе гаркаваты і мутны. Пасля вытрымкі можна заўважыць, што лісточкі змянілі пах — ён стаў кветкава-салодкім. Самы час іх сушыць. Можна ў духоўцы, а я паспрабавала зрабіць гэта ў мікрахвалёўцы. Сухі чай трэба скласці ў слоік, шчыльна закрыць і яшчэ даць месяц выстаяць. Толькі пасля гэтага частуйцеся духмяным напоем, да таго ж карысным — дапамагае пры галаўным болі, праблемах са страўнікам, бяссонніцах.

Але гэта яшчэ не ўсё: маладыя лісточкі расліны багатыя вітамінамі. Іх пускалі ў салаты, рабілі з іх пюрэ. Некалі скрыпень нават выратоўваў ад голаду. З засушаных каранёў рабілі муку і пяклі хлеб. Карэнне, дарэчы, можна есці, як сырым, так і вараным.

Вось некалькі праверaных рэцэптаў салатаў ад мяне:

№1. Маладыя лісточкі апусціце на пару хвілін у кіпень, нашынкуйце, дадайце зялёную цыбулю, цёрты хрэн, соль. Запраўце смятанай, папырскайце лімонным сокам.

№2. Натрыце на тарцы карэнне скрыпеню, яблык, сыр і запраўце маянэзам.

Вольга Іванаўна, *г. Тураў.*

ЖЫВЫЯ ВІТАМІНЫ

У дзяцінстве я не любіла ягады. Пакуль не трапіла на канікулы да бабулі. На якія яна толькі хітрыкі не ішла, каб накарміць мяне вітамінамі. У выніку я ўпісвала нават чырвоныя парэчкі. А ўсяго толькі і трэба было — расцерці ягады з цукрам і на ноч паставіць у халадзільнік. Маса гусцела, застывала, мне падабалася «наразаць» яе лыжкай. Чарніцы і суніцы ішлі з малаком, маліны падаваліся з мёдам. Часта бабуля выціскала сок з ягад, а макуху залівала вадой, кіпяціла. Пасля іх змешвала, у выніку мы пілі «жывыя вітамінчыкі».

Пазней пачаліся эксперыменты з жэле. Бабуля награвала ягады з невялікай колькасцю вады, каб тыя пусцілі сок, які пасля цадзіла праз тканіну, дадавала цукар, кіпяціла і разлівала па слоіках. Мне, малой, цікава было назіраць, як яна змешвала сокі з розных ягад — малін, чорных і чырвоных парэчак. Безумоўна, жэле нарыхтоўвалася на бяз'ягадны перыяд, але для мяне спецыяльна налівалі крыху ў кубачак, каб астылую масу паставіць у лядоўню (там яна хутчэй гусцее).

Сёння ўжо я шукаю прыёмчыкі, каб прывучыць сваіх дзетак да ягад. Мы нанізваем суніцы на травінку. Малым падабаецца такі «шашлык». Не цікавіць неслухаў талерка з садавінай? Але праблема рашаецца, калі кавалкі яблыкаў, бананаў, ягады нанізаць на шпажкі.

Акрамя таго сама раблю для дзетак мармелад. Чорныя парэчкі на некалькі гадзін засыпаю цукрам (грам 800 на 1 кілаграм ягад). Калі ягады пачынаюць пускаць сок, вару на невялікім агні хвілін 20. Астуджаную масу пераціраю праз сіта. І зноў стаўлю на агонь на гадзіну. Застаецца толькі разліць масу па формачках і астудзіць.

Адзін з нашых любімых дэсертаў — айс-крэм. У кубачак кладу марозіва, ягады, фрукты (свежыя ці кансерваваныя), заліваю сіропам ці сокам. Айс-крэмы не размешваюцца і падаюцца з лыжачкай. Смачна есці!

Алена ВАЎЧКОВА, *г. Мінск.*

Даражэнькія гаспадары і гаспадыні, дзяліцеся і вы свайімі праверанымі часам рэцэптамі і парадамі. Хатнік чакае вашых лістоў.

■ Настальгія

Паскачам у «рызіначку» і пойдзем закопваць «сакрэцікі»

Мама двух сыноў адрадзіла гульні свайго дзяцінства

На прэзентацыі набораў для творчасці «Сакрэцікі» і «Рызіначкі» сабралася шмат маладых матуль з дзеткамі. Спачатку для разагрэву мастачка Ніка Сандрас правяла невялічкі майстар-клас. Хлопчыкі і дзяўчынкі малявалі панду — галоўнага казачнага персанажа праекта, які дапамагае ўспомніць правілы гульняў па інструкцыі. А пасля ўсе пайшлі ў двор скакаць у «рызіначку» і закопваць «сакрэцікі». Пакуль дарослыя «вярталіся» ў сваё дзяцінства і дзяліліся ўспамінамі з сыночкамі-дочкамі, мы пасакрэтнічалі з аўтаркай цудоўнай ідэі, мамай Марэка і Яна, журналісткай Ганнай Трубачовай.

У падарункавым наборы «Сакрэцікі» вы знойдзеце падрабязную інструкцыю, бяспечныя шкельцы і шмат чароўных дробязяў.

— Ганна, раскажыце, як нарадзілася ідэя падарункавых набораў для ўсёй сям'і?

— Аднойчы я гуляла ў двары са сваімі дзецьмі. І яны папрасілі мяне паказаць якую-небудзь гульню з майго дзяцінства. У той дзень мы зрабілі з імі наш першы сумесны «сакрэцік». Выкапалі ў зямлі неглыбокую ямку. Яе дно павінна быць плоскім, як палатно мастака. І паклалі туды свае чароўныя скарбы. У кішэнях Марэка і Яна якраз завалялася некалькі гаечак і болцікаў, у маім — ракавінка. Накрылі ўсё гэтае багацце кавалачкам шкла ад бутэлькі, прыціснулі, загадалі жаданне і закапалі свой «сакрэцік».

— Так, я таксама ў дзяцінстве рабіла такія «сакрэцікі». Памятаю, як старанна выбірала месца, каб, не дай бог, ніхто не знайшоў. А потым, пакуль сяброўка стаяла на варце, закопвала яго.

— Так, выбіраць месца для «сакрэціка» трэба з асаблівай асцярожнасцю — важна, каб ніхто не здагадаўся, для чаго вы капаеце ямку. Гэтак жа абачліва мы хавалі і гатовы скарб: замяталі зямлю галінкай, закідвалі лісцем. А яшчэ мы рабілі лжывыя «сакрэцікі»: сапраўдны скарб мы хавалі глыбей і засыпалі тонкім слоем зямлі. Зверху клалі ў ямку што-небудзь зусім нецікавае, накрывалі шклом, і ўжо тады закопвалі. І калі хтосьці ўсё ж такі дабіраўся да гэтага скарбу, ён раскопваў толькі верхні, ілжывы «сакрэцік»: бачыў, наколькі ён нецікавы, і не капаў глыбей.

«Сакрэцікі», як правіла, рабілі ў адзіноце ці, у крайнім выпадку, разам з вельмі надзейным і верным таварышам. А можна было падарыць сябру карту, на якой пазначана месца, дзе закапаны скарб. Так гульня для аднаго ператваралася ў вельмі займальную прыгоду — адшукаць «сакрэцікі».

— Марэку і Яну спадабалася гэтая гульня?

— Вельмі. Менавіта таму я і падумала, а чаму б не нагадаць пра яе сучасным бацькам? Бо я, як мама, бачу, што эпоха спажывання негатыўна адбіваецца і на дзецях. Бацькі ўвесь час набываюць ім новыя цацкі. Многія з забавак звычайна ламаюцца ў той жа дзень і выкідваюцца... Не хачу гаварыць, што наша дзяцінства было бязвоблачным, але там былі вельмі цудоўныя моманты. Напрыклад, тое, што мы знаходзілі чым заняцца і ў што пагуляць без дарагіх цацак. Стваралі гісторыі і казкі пры дапамозе сваёй фантазіі і падручных матэрыялаў. Памятаю, ідзеш са школы, бачыш, прыгожы фанцік валяецца — раз-два і забацаў сабе «сакрэцік» дзесьці пад дрэвам. Сёння дзеці, на жаль, мала гуляюць на вуліцы, а пад выхаваннем у лепшым выпадку бацькі разумеюць выключна актыўнае наведванне гурткоў.

Мне вельмі хочацца знайсці спосаб аб'яднаць сем'і, дзяцей паміж сабой. Мару, каб дзіцячыя галасы вярнуліся ў двары. Каб хлопчыкі і дзяўчынкі гулялі ў «пліткі», «сакрэцікі», «класікі», «рызіначкі». Менавіта таму я і выпусціла наборы для сямейнага баўлення часу. Гэта — не замерлая цацка, а гісторыя, якую бацькі і дзеці змогуць працягнуць самастойна. І для гэтага не патрэбна шмат грошай. Усё можна знайсці пад рукой, на зямлі або ў кішэні. Дастаткова толькі падключыць фантазію. Тым больш, запытайцеся ў любога дзіцяці, што ён лічыць смеццем, і вы зразумееце, што для дзіцячага ўяўлення няма нічога, што можна было б выкінуць, не задзейнічаўшы ў гульню... Многія дарослыя падсоўваюць малым мяккіх мішак, а яны хочуць гуляцца з анучкамі, маміным чырвоным лакам для пазногцяў ці з татавымі шурупчыкамі. Гэта для іх калі ўтрох, учатырох і вялікімі кампаніямі, разбіўшыся на пары... Праўда, у нямногіх дзяўчынак была такая гумка (у часы дэфіцыту яе цяжка было купіць), таму яе шчаслівая ўладальніца станавілася гераіняй двара — ёй дазвалялі пачынаць гульню першай.

— Раскажыце, што ўваходзіць у наборы «Сакрэцікі» і «Рызіначкі»?

— Бяспечныя шкельцы, вострыя краі якіх аплавіў у печы мастак па шкле Сяргей Козыр, каб дзеці не парэзаліся. А таксама чатыры пакуначкі з пярынкамі, пацеркамі, ракавінкамі, пазламі, стужачкамі, кветкамі... Чароўныя дробязі для набораў «Сакрэцікі» збіраліся ўсёй нашай сям'ёй. Кожная ракавінка, каменьчык прывезены з розных мораў, манеткі — з розных краін. Кветкі мы з дзецьмі збіралі і сушылі. Пярынкі, абрэзкі паперы тварылі разам з намі нейкія вырабы. Кавалачкі канструктараў і пазлаў, запчасткі ад розных цацак і прыбораў, усялякія шарыкі-гузікі жылі з намі ў адной кватэры доўгія гады — і цяпер мы рады падзяліцца сваімі скарбамі, але, галоўнае, ідэяй стварэння «Сакрэцікаў» і прыкладам таго, як можна рабіць цуд з нічога.

Сёння дзеці, на жаль, мала гуляюць на вуліцы, а пад выхаваннем у лепшым выпадку бацькі разумеюць выключна актыўнае наведванне гурткоў.

У наборы «Рызіначкі» вы знойдзеце дзве гумкі: чорную і белую, класічных колераў. Менавіта пра такія, белыя, марыла кожная дзяўчынка майго дзяцінства. Чорных тады не было ў продажы. Але, шчыра прызнацца, у мяне ў дзяцінстве не было зусім ніякай. Гэта яшчэ адна прычына, чаму я вырашыла адрадзіць гульню — каб, нарэшце, пакласці ў кішэню сваю ўласную гумку, прытым любімага, чорнага колеру *(смяецца)*.

Акрамя таго, у наборах вы знойдзеце вясёлую інструкцыю па абыходжанні з чароўнымі дробязямі і правілы гульні ў «рызіначку», якія праілюстравала Ніка Сандрас.

— Інтуіцыя мне падказвае, што вы не збіраецеся спыняцца толькі на «рызіначках» і «сакрэціках»?

— Так, ёсць ідэя адрадзіць яшчэ некалькі забавак з нашага дзяцінства. Я вельмі шмат размаўляю з людзьмі, і высветлілася, што нават у розных частках таго ж Мінска гулялі ў зусім розныя гульні. Плюс у тых жа «рызіначак» ёсць яшчэ некалькі відаў правілаў. Яны ж былі папулярныя ва ўсім свеце. Планую ў будучым рабіць тэматычныя «сакрэцікі». Ведаеце, для мяне не так важна прадаць свае наборы, галоўнае — перадаць ідэю. Паказаць, што чараўніцтва і творчасць — яны абсалютна ўсюды, трэба толькі шырэй глядзець. Падавалася б, што тут такога, ідзі ды купі гумку ў краме. Менавіта да гэтага я і заклікаю бацькоў. Больш творча, з фантазіяй падыходзіць да выхавання.

Надзея ДРЫЛА. *dryla@zviazda.by*

Фота Аляксандра ЖДАНОВІЧА.

Ганна Трубачова (злева) і Ніка Сандрас (побач) сцвярджаюць, што калі скачаш, заўсёды становішся радасней.

■ Выйсце ёсць!

12 КРОКАЎ ДА ЖЫЦЦЯ

Побач з вёскай Камяніца, на маленькім хутары, які мясцовыя жыхары называюць Брэнькаў, больш за 5 гадоў працуе рэабілітацыйны цэнтр для людзей, якія пакутуюць ад наркатычнай залежнасці. Стварыла яго рэспубліканская дабрачынная грамадская арганізацыя «Жыццё». Праблемамі нарказалежных людзей яна займаецца ўжо 12 гадоў.

Дапаможная гаспадарка ў рэабілітацыйным цэнтры — выдатны стымул навучыцца прыязным адносінам да жывёл.

— Ціхае і спакойнае месца ў адноснай далечыні ад гарадскога тлуму — адна з галоўных умоў паспяховай рэабілітацыі нарказалежных людзей, — адзначыў **адзін з кіраўнікоў цэнтра Дзмітрый ЦЫБУЛЬКІН.** — Справа ў тым, што ў медыцынскіх установах людзям здымаюць фізічную залежнасць і так званую наркатычную «ломку», але ў чалавека, які прымае забароненыя рэчывы, пакутуе не толькі цела, але і душа. На Магілёўшчыне наш цэнтр — адзіная ўстанова, дзе чалавек можа перамагчы залежнасць ад наркотыкаў ва ўсіх сэнсах. Прычым абавязковая ўмова — дабравольная згода чалавека. Калі за яго просяць бацькі, родныя, а сам не жадае пазбаўляцца ад залежнасці, то дапамагчы яму немагчыма. Нашы былыя рэабілітанты, якія справіліся са сваімі праблемамі, цяпер актыўна дапамагаюць іншым пазбавіцца ад наркотыкаў. Яны ідуць да сваіх былых сяброў, натхняюць іх на лячэнне жывым прыкладам.

У цэнтры стараюцца кантакты са знешнім светам звесці да мінімуму — дзеля таго, каб у чалавека было менш спакусы вярнуцца да мінулага жыцця.

Рэабілітацыйны цэнтр — гэта два падворкі, якія выкупіла дабрачынная арганізацыя. Вяскоўцы, дарэчы, паставіліся да новых суседзяў прыязна, ды яны і пасяліліся на даволі значнай адлегласці ад вёскі. Пакуль пыталася, як праехаць на Брэнькаў, усе з задавальненнем паказвалі і хвалілі насельнікаў: «Звычайныя маладыя хлопцы», «Добрыя, вітаюцца заўсёды!».

У цэнтры пастаянна пражываюць чатыры чалавекі. Трое з іх праходзяць рэабілітацыйную праграму, а чацвёрты выконвае функцыі куратара і дарадчыка, настаўніка і проста сябра.

— Да нас прыходзяць людзі, якія знаходзяцца на глыбокім дне залежнасці, некаторыя ніколі не працавалі, кралі, вялі антыграмадскі лад жыцця, — гаворыць **Яўген ЮДЗІН, былы наркаман са стажам.** — Пакуль што яны прыязджаюць з Мінска, але мы ў першую чаргу чакаем ахвотнікаў з Магілёва і вобласці. Проста не ўсе яшчэ ведаюць пра наш цэнтр і як да нас прыехаць.

У 16 гадоў Жэня пачаў ужываць наркотыкі. На іх ішлі ўсе грошы. Хлопец нарабіў шмат пазык, сапсаваў адносіны з бацькамі і блізкімі. Родныя паставілі на ім тлусты крыж. Аднойчы Яўген сам зразумеў, што ён залежны, паспрабаваў лячыцца ў бальніцы. Выйшаў — і ўсё пачалося зноў. Знаёмыя падказалі адрас цэнтра для нарказалежных у Радашковічах. Там ён прайшоў гадавую праграму рэабілітацыі, якая складаецца з 12 крокаў, пасля — шэсць месяцаў адаптацыі да жыцця ў грамадстве. Цяпер дапамагае іншым атрымаць свабоду ад «чортавага зелля».

Па праграме 12 крокаў працуюць усе цэнтры РДГА «Жыццё». Ідэю падказалі галандцы, дзе легалізаваны продаж так званых «лёгкіх» наркотыкаў і створана шырокая сетка рэабілітацыйных устаноў для нарказалежных.

— Побыт нашых рэабілітантаў вельмі просты, — расказвае Яўген. — У кожнага ўласны ложак, тумбачка для асабістых рэчаў. Тэлефонам, камп'ютарам, тэлевізарам, інтэрнэтам карыстацца нельга. Калі блізкія хочуць звязацца са сваяком, то яны тэлефануюць мне.

Увогуле, у цэнтры стараюцца кантакты са знешнім светам звесці да мінімуму — дзеля таго, каб у чалавека менш спакусы было вярнуцца да мінулага жыцця. Рэабілітанты падпісваюць спецыяльныя дакументы, ім тлумачаць абавязкі, правілы паводзін. Некаторыя, здараецца, парушаюць рэжым, але строга іх не караюць. Да кожнага чалавека шукаюць індывідуальны падыход.

— Кожны дзень у нас распісаны пагадзінна, — паказвае Жэня стэнд з абавязкамі. — Раніца заўсёды пачынаецца з малітвы. Наш цэнтр існуе не толькі на дапамогу галандскіх спонсараў, а яшчэ і на ахвяраванні вернікаў, таму шмат часу адводзім вывучэнню Бібліі. Акрамя таго, у хлопцаў часта жыццёвыя прыярытэты расстаўлены няправільна, ці іх увогуле няма, таму далучэнне да спрадвечных духоўных каштоўнасцяў — адзін з галоўных кітоў нашай праграмы. Таксама шмат увагі ўдзяляецца фізічнай працы. За кожным з нашых насельнікаў замацаваны пэўныя абавязкі. Не ўсе рэабілітанты маюць прафесіі, прыходзіцца прывіваць ім самыя элементарныя працоўныя навыкі. У нас ёсць падсобная гаспадарка: куры, козы. Раней гадавалі бычкоў, свіней. Садзім вялікі агарод, дапамагаем з сяўбой ці ўборкай, калі трэба, суседзям.

Калі за яго просяць бацькі, родныя, а сам не жадае пазбаўляцца ад залежнасці, то дапамагчы яму немагчыма.

Вольнага часу ў насельнікаў цэнтра амаль што няма. Культурная праграма для рэабілітантаў таксама накіравана на паляпшэнне іх маральнага і фізічнага стану. Калі дазваляе надвор'е, яны гуляюць у баскетбол, валейбол, ходзяць у паходы...

Асабліва адведзеных дзён для сустрэч з роднымі няма ў асноўным таму, што блізкія не падтрымліваюць з імі адносін. А тыя, хто не страціў сваяцкіх сувязяў з залежнымі, не заўсёды вераць у станоўчы рэзультат. А ён ёсць. З 23 чалавек, якія прайшлі праграму рэабілітацыі ў Камяніцы і паспрабавалі змяніць сваё жыццё да лепшага, сем сталі паўнапраўнымі членамі грамадства. Яны цалкам вызваліліся ад залежнасці, уладкаваліся на працу, наладзілі адносіны з роднымі, стварылі ўласныя сем'і і нарадзілі дзяцей.

Святлана МАГІЛЕЎЧЫК

■

З першых вуснаў

Кірыл МІХАЛЬСКІ:

— За шэсць гадоў паспрабаваў на сабе амаль усе наркатычныя сродкі. Проста было цікава. Яшчэ ў дзяцінстве страціў бацькоў, дык захацеў як мага раней лічыць сябе самастойным. Красці не ўмею, прыходзілася вельмі шмат працаваць, каб зарабіць на чаканую «дозу». Калі прыехаў у вёску на рэабілітацыю, быў у шоку. Уяўляеце — усё жыццё правесці ў мегаполісе і потым апынуцца ў абсалютнай цішыні. Тут, зразумеў пасля, важнае кожнае дзеянне. Ты вучышся планаваць свой час, самадысцыплінуешся. Пачаў заўважаць тое, чаго не бачыў раней, напрыклад, прыгажосць прыроды, стаў цаніць сяброўскія адносіны.

Аляксей УСЦІНАЎ:

— З дзяцінства мяне прываблівала ўсё дрэннае. З 13 гадоў пачаў калоць ін'екцыйныя наркотыкі. Сядзеў неаднаразова ў турме за крадзеж. Сябры паміралі ад перадазіровак, і я звыкся з тым, што ў хуткім часе і мяне напаткае такі ж лёс. Аднойчы сустрэў знаёмага, пра якога даўно нічога не чуў і думаў, што яго няма на гэтым свеце. Ён быў абсалютна здаровы, расказваў, што ажаніўся, ёсць дзеці, а галоўнае, некалькі гадоў не прымае наркотыкаў. Цяжка было паверыць у гэта. Я працягваў жыць сваім жыццём, але сябар не забыў пра мяне: пісаў лісты, дасылаў невялікія падарункі. Ён спачатку адвёў мяне ў рэабілітацыйны цэнтр у Радашковічах, а потым я трапіў сюды. За гэты час прыйшло пераасэнсаванне ўсяго ранейшага жыцця, шмат чаму прыйшлося вучыцца нанава. Вельмі ўдзячны людзям, якія дапамагаюць мне. Я ніколі ў жыцці не працаваў, а тут у мае абавязкі ўваходзіць догляд жывёл, і гэты занятак мне вельмі падабаецца.

Пляцоўку для заняткаў спортам стварылі самі.

■ Бацькоўскі практыкум

НЕКАЛЬКІ СПОСАБАЎ ВЫГАДАВАЦЬ... ЗАЛЕЖНАГА

Ці можа быць так, што бацькі самі штурхаюць дзяцей да ўжывання псіхаактыўных рэчываў? Яшчэ як можа...

Традыцыйна магутным фактарам рызыкі далучэння да дурманных рэчываў лічыцца няпоўная сям'я. Аднак многія сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што значная частка падлеткаў-наркаманаў усё ж такі маюць абаіх бацькоў. Пэўна, больш важны не столькі склад сям'і, колькі атмасфера ў ёй, эмацыйная блізкасць і давер.

— Часцей і раней за ўсё нарказалежнае жыццё пачынаюць няпоўнагадовыя з сем'яў, дзе выхаванне адбываецца па тыпе недахопу ўвагі — гіпаапекі, калі дзеці і падлеткі растуць самі па сабе, — тлумачыць **псіхолаг Цэнтра дружалюбнага стаўлення да падлеткаў «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК.** — Недастатковая ўвага з боку старэйшых можа быць абумоўлена спецыфічнымі стасункамі паміж бацькамі, якія так заняты высвятленнем сваіх адносін, што на дзіця проста не застаецца часу. Праўда, у апошні час гіпаапека ўсё часцей звязваецца з тым, што бацькі вымушаны асноўны час праводзіць на працы. Цудоўна разумеючы, чым можа пагражаць дзіцяці дэфіцыт увагі, яны не ў стане нічога змяніць. Адмова ад работы аднаго з бацькоў або пераход на менш інтэнсіўны рэжым можа вельмі негатыўна адбіцца на бюджэце сям'і. Гіпаапека — гэта яшчэ і пра сем'і, у якіх адзін ці абое бацькоў пакутуюць ад алкагольнай/наркатычнай залежнасці. Верагоднасць уцягвання ў тое ж самае і дзяцей вырастае тады ў разы...

Цікава, што адваротны варыянт — гіперапекі — таксама небяспечны. Бо гэта пастаянны кантроль і адсочванне кожнага кроку, пазбаўленне любой магчымасці праявіць сваю самастойнасць. Такі стыль выхавання прыводзіць да таго, што падлетак лёгка паддаецца знешняму ўздзеянню. Трапляючы пад уплыў кампаніі, ён можа рабіць учынкі, якія ў глыбіні душы лічыць няправільнымі, толькі таму, што не ўмее адмаўляць. Акрамя таго, такая псіхічная надламанасць можа прывесці да сур'ёзных нервовых зрываў і нават да спробы суіцыду.

Самі бацькі закладваюць у дзіцяці асновы залежнага ўспрыняцця свету, цярплівае стаўленне да любой залежнасці. І айчынныя, і замежныя наркалагі салідарныя: менавіта ў аўтарытарных сем'ях вельмі вялікі працэнт дзяцей пачынае ўжываць наркотыкі. Наркатычная залежнасць становіцца своеасаблівай формай праяўлення пратэсту, адзіным шанцам адваяваць сваю тэрыторыю.

Яшчэ адзін плод гіперапекі — інфантылізм, непадрыхтаванасць да жыццёвых цяжкасцяў, няздольнасць самастойна вырашаць пытанні. Зноў жа, такіх лёгка падбіць на што заўгодна, у тым ліку пакаштаваць наркотык. Калі мы маем на ўвазе «куміра сям'і» — аб'ект усеагульнага пакланення, адзінае дзіця ў шматлікай радні, то для яго звыклымі будуць неабмежаваная ўлада над сваякамі, якія не пакараюць, і пагарда ў дачыненні да іх, а заадно і да настаўнікаў, і да равеснікаў. Сямейнае выхаванне ў такіх выпадках фарміруе эмацыянальна няспелую асобу, з недастаткова развітым уменнем кантраляваць свае паводзіны і сувымяраць жаданні і магчымасці ў задавальненні сваіх патрэб, са скажонай сістэмай духоўных каштоўнасцяў. Такі чалавек — эгаіст з прэтэнзіяй на неадкладнае задавальненне сваіх жаданняў. Ён будзе прагнуць поспехаў і пастаянна сутыкацца з супярэчлівасцю паміж імкненнямі, амбіцыямі, жаданнямі і магчымасцямі іх рэалізаваць. Куміры, якія прывыклі быць прадметам усеагульнага захаплення, часта дэманстратыўныя, ім даспадобы любыя эксцэнтрычныя выхадкі і любы шакіруючы ўчынак, якім здаецца і ўжыванне алкаголю ці наркотыкаў. Гэта яны звычайна хочуць «усіх перапіць».

ЯК БУДЗЕМ ВЫХОЎВАЦЬ

1. Паразважайце над сваёй асабістай сістэмай каштоўнасцяў у дачыненні да выхавання.
2. Будзьце сумленнымі. Усе дзеці вельмі адчувальныя да хлусні.
3. Разумна ацэньвайце ўзровень развіцця дзіцяці.
4. Пазбягайце доўгіх, нудных тлумачэнняў і размоў з дзецьмі.
5. Імкніцеся своечасова ўлавіць змены. Яны могуць праяўляцца ў неардынарных пытаннях, паводзінах дзіцяці.
6. Паважайце ў дзіцяці індывідуальнасць. Не праецыруйце на яго свае інтарэсы і захапленні.

Схільнасць да наркатычнай залежнасці можа быць таксама вынікам нейкай псіхічнай траўмы, справаканай неспрыяльнай дамашняй атмасферай, няўдачамі ў школе або фізічнымі недахопамі і комплексам непаўвартасці. Такія траўмы бываюць прычынай спецыфічнага неўрозу, пры якім дамінуюць страх, трывога, адчай, безнадзейнасць. Гэта прыводзіць да дэпрэсіі, страты пачуцця ўласнай годнасці і значнасці. Выпадковае ўжыванне нейкага дурману ў такой сітуацыі можа падахвоціць далейшае ўжыванне.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ВАНДРОЎКА АД ГУЧЫ

У сярэднім слове загалоўка можна проста пераставіць месцамі літаркі — і атрымаецца тое самае, толькі ўжо не так прэтэнцыёзна. А нам якраз прэтэнцыёзнасць тут патрэбна. Бо падарожжа не абы-куды.

У НАШАЙ кухні на сцяне вісіць талерка з выявай палаца Сапегаў. Той найбольш знакамітай іх рэзідэнцыі, што ў Ружанах. Пабудаванай замест папярэдняй, што ад Гучы. Талерка сабе вісіць, а нам клопат: выбіраючыся ў доўгачаканае і з навуковай педантычнасцю распланаванае падарожжа-экспедыцыю ў наднёманскія вёскі Паніжаны, Горны, Глядавічы — на пошукі слядоў вядзьмарак і лекарак, якія жылі там паўтара стагоддзя таму, і загадкавых раслінак пад экзатычнымі назвамі зязюльчыны ручкі, казіныя бароды і шчасце, — мы чэрцім свой маршрут праз Ружаны, дзе ўжо былі і ўсё бачылі. І нават, між іншым, у тамтэйшыя сутарэнні спрабавалі спускацца.

Хто б мог падумаць, што вяртацца на месцы ранейшых вандровак нас можа прымусіць насценная талерка — звычайная парцэлянка з архітэктурнай выявай. Але так ёсць: гэта яна, купленая некалькі гадоў таму і перавешаная ў кухню пасля рамонту, сагітавала нас на новы візіт у Ружаны, зноў да Сапегаў. Ну, і да Гучы ўжо заадно.

БЫЎ, значыць, такі архітэктар. Зваўся Санці, а Гучы — прозвішча, з дадаткам Ф'ярэнці-на. Палац у Ружанах, створаны талентам Гучы, ніяк не магчыма нам сёння ўбачыць (бо разбурылі яго, а пазней на свой манер пераўзвялі розныя пепельманы ды нейманы, ды іншыя саксонскія муляры, якіх у ВКЛ панапрывозіў Аўгуст II), але ўявіць — вельмі лёгка. У любым выпадку палац па праекце Санці Гучы Ф'ярэнціна выглядаў на свой час як архітэктурная звышнавіна і знаходка: не «замкнёным» (то бок, у літаральным сэнсе замкам, са схаваным ад вачэй дваром), а ўрачыста разгорнутым, «замкам навыварат», з шырока прасцёртымі «крыламі» і парадным уездам навідавоку.

Велічны і па сёння, і ў напаўразбураным стане пампезны, цэнтр як былой, так і сённяшняй архітэктурнай кампазіцыі называецца ўражліва проста. На дзіва проста. Як бакоўка ў сялянскай хаце — сенцы. Але ў гэтыя сенцы ўваходзілі спрэс магнаты. Бо гаспадарамі сенцаў былі Сапегі. Аблокі над гэтым мястэчкам плылі тады іншыя — бо выліліся з тых часоў мільярды снапоў дажджоў, халодных і цёплых, занудлівых, спорых і абнадзейвальных. Але сонца ў сапегаўскія вокны зазірала тое самае, якое свеціць нам цяпер па дарозе, прымушаючы апускаць сонцаахоўныя брылі нашага «шатла».

Пасля Льва тут панавала шмат іншых Сапегаў. І калі б носьбіты гэтага прозвішча былі трошкі менш заліхвацкія ды амбіцыйныя, трошкі больш сціплыя і памяркоўныя, калі б не дражнілі крыўдлівую шляхту, калі б не ваявала яна з імі, калі б не разбурыла той палац па праекце Гучы... Але ў гісторыі заўсёды адбываецца тое, што адбываецца. У канцы XVI стагоддзя шляхта разбурыла збудаванне Гучы, ваюючы з Сапегамі. Замак-палац пасля зноў будаваўся. Ужо ў навейшым стылі ракако. Тое, што мы бачым цяпер, — вынік працы Яна Самуэля Бекера, прыдворнага архітэктара новых, наступных Сапегаў — ужо з XVIII стагоддзя. Калі не лічыць узноўленых брамы і флігеля — напаўразбураны вынік. Бекер збудаваў тут і тэатр на сем куліс і дваццаць дзевяць ложаў (у два ярусы, па чатырнаццаць у кожным і з каралеўскай ложай у верхнім ярусе, пасярэдзіне), і канцылярыю наноў, і кардэгардыю, але шмат што з запланаванага не збудаваў. Бо Рэч Паспалітую падзялілі, бо адзін Сапега-гаспадар памёр, а другі — наступны, — не маючы такой хваткі, узяў ды аддаў палац суконшчыкам у арэнду.

Не верыцца, але вось тут, у гэтай велічнай разрусе, яшчэ ў 1944-м працавала ткацкая фабрыка. Немцы, адступаючы, яе спалілі. І толькі ў 1965-м тут спыніўся выраб кафлі. Самай звычайнай, без выявы герба «Ліс».

Але сапегаўскую кафлю тут можна бачыць: яна, малайчынка, схавалася і чакала раскопак. І так сябе захавала, што здолела стаць экспанатам музея, размешчанага ў флігелі каля брамы. Тут жа, у флігелі, можна бачыць і посуд, якім у гэтым «доме» карысталіся (бачыць яго — усё роўна што быць сведкай візіту сюды ў 1644-м Уладзіслава IV з Цэцыліяй-Рэнатай Аўстрыйскай. Бо як прымалі іх, караля з каралеваю і дваром, «што прыбылі ў Ражану з Жыровіц», дык, кажуць, ажно дзевяць дзён, не перастаючы, частавалі), і сапегаўскі гузік (належаў Аляксандру Сапегу, які памёр у 1793-м, і значыць, гузіку, трэба лічыць, не менш як дзвесце з «гакам»!), і... падлогу старой канцылярыі! Прама пад шклом, пад падлогай навейшага ўзроўню.

У сенцы, што праглядаюцца скрозь арку брамы, уваходзілі некалі выключна магнаты.

У 1875-м. Так бачыў Орда.

Буркатанне сварлівай цётачкі

Рэчы абсалютна не складаныя не толькі на першы, але і на другі, трэці, пяты, сто пяты пагляд; дзеянні, якія не патрабуюць не тое што асаблівых, а нават самых звычайных намаганняў; ідэі настолькі відавочна прыцягальныя, што дзіву трэба давацца, чаму дагэтуль не рэалізаваныя, — усё гэта, як будзённая практыка пераконвае, ёсць нешта немагчымае-неверагоднае. Непад'ёмнае, неабдымнае. Фантастычнае. Як на Марс паляцець. Хіба складана, ведаючы, што маці Марка Шагала трымала бакалейную лаўку, арганізаваць такую лаўку пры яго віцебскім доме-музеі і пасадзіць гандляваць у ёй жывую Фейгэ-Ітэ? (Апрануць у Фейгэ-Ітэ гандлярку сувенірамі і кветкамі? Або выдаваць за яе — гаспадыню! — экскурсаводку?) Кошт пытання — адрэз на сукенку. Вынік — айчынны турызм на ўзровень вышэй існуючага. Хіба доўга выкінуць з Нясвіжскай ратушы макет пісарчука і пасадзіць пісарчука сапраўднага, апранутага ў той жа строй? Тут кошт пытання — зарплата. Але хіба шкада яе выплачваць за сумленную працу?..

А пры ружанскіх развалінах я даўно б пачала прадаваць сапяжанку.



Так выглядала брама ў 1920-х.

Рамантыкам

Што ў ружанскім палацы найбольш нас уразіла? Ну, акрамя самога палаца, бо ён жа па-за канкурэнцыяй. Памятаючы пра насценную талерку, я сказала б, што сувенірная лаўка. Але... У адным з залаў музея размешчаны вялізны макет: якім палац быў і меўся быць далей, калі б усё інакш склалася. Гэтае пап'е-машэ накладаецца ва ўяўленні на каменны цуд за вокнамі музея — і ты лёгка-лёгка прымаеш усё як ёсць: вось ён, у зале музея, палац адноўлены, а там, за вокнамі, жывая даўніна. «Два ў адным», так бы мовіць. І табе не хочацца нічога ўзнаўляць і некага падбухторваць на гэтую, далібог, спрэчную справу. Ты проста ганарышся тым, што і ў цябе, тваёй краіны ёсць свой... ну, амаль што калізей.

* * *

У ВАНДРОЎКУ нас можа паклікаць што заўгодна: стомленасць ад штодзённай працы і прага новых уражанняў, жаданне весці «падарожны» блог і абавязак бацькоў паказваць дзецям гістарычна-культурную спадчыну, унутраны патрыятызм і паказная цікаўнасць... А бывае, што ў вандроўку кліча набытая раней памятка, звычайны папулярны сувенір. Пераглядзіце, спадарства, свае магніцікі. Можа, там, дзе вы ўжо былі, вас яшчэ нешта чакае?

Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

16 ліпеня ў пасёлку Кільмезь у Кіраўскай вобласці Расіі праводзіцца «Вяцкі лапаць», а на рацэ Рэйн у Германіі ў той самы час — «Кёльнер ліхтэр», фестываль феерверкаў. Таму, хто не ўмее быць адначасова тут і там, прапануецца трэцяе — Феста дэль Рэдэнторэ ў Венецыі, свята ў гонар збавіцеля ад чумы.

Галоўны фэст музыкі і тэхналогій называецца Alfa Future People. Праводзіцца 22—24 ліпеня. Хэдлайнер — Армін ван Бююрэн, «ікона транс-музыкі». Частку тэхналогій запаўняюць розныя звышінавацыйныя гаджэты, інтэрактыўныя атракцыёны, шоу робатаў і пляцоўкі высокатэхналагічных кадраў. Калі зацікавіліся, то вам праз тыдзень трэба як-небудзь трапіць у Ніжні Ноўгарад.

29—31 ліпеня ў Сан-Марына — Дні Сярэднявечча. Кажуць, штогод напрыканцы ліпеня гэты горад пераносіць сябе на стагоддзі назад. І сапраўды варта паглядзець, як гэта можа адбывацца з горадам, які і без таго ўяўляе сабою музей ды яшчэ жыве па Канстытуцыі 1600 года.

17 ліпеня а дзявятай раніцы каля помніка Пушкіну ў Віцебску чытаецца тысяча вершаў пра гэты горад. Увогуле, быць у бліжэйшыя выхадныя дні ў Віцебску азначае знаходзіцца «На сямі вятрах». Такая назва ў фэсту вулічных мастацтваў, у якім бяруць удзел тэатралы, мастакі і паэты адкуль заўгодна і ў неабмежаванай колькасці.

Вішнёвае свята ў Глыбокім працягнецца сёлетні чацвёрты раз ад 18 да 23 ліпеня. Конкурс «Вішнёвыя парачкі», вішнёвы сэлфі-квэст, выступленне гурта «Вішнёвы горад», шэсце ад скульптуры «Глыбоцкая вішня» з самой вішнёвай каралевай, гашэнне вішнёвай паштовай маркі, вішнёвы настрой на кулінарныя выкамуры... Ці не зашмат? На ўсё не паспееце, але вішань наесціся там можна ўволю.

Штогадовы «Наш Грунвальд» чакае сёлета сваіх аматараў 23-24 ліпеня. Як заўсёды, у «Дудутках», як і раней, з рыцарскімі баямі, кірмашом і рамеснікамі, старадаўнімі гульнямі і анімацыяй. Танцуюць, спяваюць, гандлююць, страляюць — і ўсё не толькі для весялосці, але і з выхаваўча-адукацыйнымі мэтамі. Хто яшчэ не ведае гісторыю? Вам на «Грунвальд», спадарства. Сустрэнемся.

■ Фотаздымак з гісторыяй

А ПАМЯЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

«Піша вам пастаянная чытачка газеты Карпук Антаніна Міхайлаўна, жыхарка горада Нясвіжа Мінскай вобласці. Мне вельмі спадабалася рубрыка «Фотаздымак з гісторыяй», і я вырашыла таксама напісаць.

Пасля смерці маёй стрыечнай сястры я разбірала яе сямейныя фотаздымкі і знайшла даволі даўнія. На адным з іх — вяселле маёй цёткі Стэфы і яе мужа Канстанціна Астроўскіх. Усе прысутныя тут — маладыя жыхары вёскі Слаўкава Нясвіжскага раёна. Па словах майго бацькі, яго маці, а мая бабуля Эфка, вельмі рана засталася ўдавой з чатырма дзецьмі. І вельмі цяжка было ў той час (а гэта было ў пачатку XX стагоддзя) гадаваць адной дзяцей. Таму, каб наладзіць вяселле сваёй дачцэ Стэфе, бабка ўлезла ў вялікія запазычванні. Але гэта, мусіць, каштавала таго. Бо гледзячы на такіх маладых, прыгожых, сціскаецца сэрца ад замілавання. Яны кахалі, жаніліся, прыбіраліся ў вясельныя ўборы — і ўсё гэта нягледзячы на нястачу.

Вельмі хочацца, каб, глянуўшы на гэты фотаздымак, хтосьці з блізкіх ці знаёмых пазнаў сваіх родзічаў або проста ўспомніў, што калісьці гэтыя людзі жылі ў вёсцы Слаўкава. Бо памяць — гэта галоўнае.

На другім фотаздымку мой татачка, Шыкула Міхаіл Юльянавіч, жыхар вёскі Слаўкава. Я не ведаю, дзе ён фатаграфаваўся, і ці не форма гэта салдата польскай арміі... Ведаю толькі, што мой татачка ваяваў у Войску Польскім, у другім стралковым палку. Дайшоў з баямі да Берліна, меў узнагароды.

У мірны час многа працаваў, любіў сваю Радзіму. А найлепшай песняй лічыў «Люблю наш край, старонку гэту». Заўсёды, калі яна гучала, у яго на вачах блішчэлі слёзы.

Памёр мой татачка на 93-ім годзе жыцця, пасля сарака дзён са смерці сваёй жонкі і маёй матулі.

Я магу бясконца гаварыць пра свайго роднага чалавека, таму ў памяць аб ім я і мой сын назвалі яго імем аграсядзібу».

■

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.

■ Майстар-клас

Як зрабіць крэйдачкі для малявання на асфальце?

Вы ідзяце на дзень нараджэння да сяброў, у якіх маленькія дзеткі? І не ведаеце, чым іх здзівіць? Ёсць ідэя! Падарыце бацькам і іх дзеткам новыя ўражанні. Напрыклад, які-небудзь незвычайны майстар-клас.

Менавіта такі падарунак атрымала Аляксандра Сержановіч са сваімі дзеткамі Янам і Юстынай, якіх я сустрэла ў майстэрні «Святло керамікі». Мы разам у той вечар зрабілі шэсць вялізных крэйдачак. Дапамагала нам у гэтай неверагодна захапляльнай справе Хэлен Машчанка. Я з захапленнем назірала, як лёгка і нязмушана гэтая маладая дзяўчына знаходзіла падыход да дзетак.

Спачатку яна навучыла нас рабіць формачкі для будучых крэйдачак. Для гэтага раздала кожнаму па кардонным тубусе ад харчовай фольгі. Яго трэба было грунтоўна абматаць кавалкам шчыльнай плёнкі (такой звычайна ў вёсцы абцягваюць парнік). І добра замацаваць яе пры дапамозе скотча ў трох месцах — знізу, зверху і па цэнтры. Дно цыліндра мы зафіксавалі плёнкай ад поліэтыленавага пакета і скотчам, каб гіпсавая маса не выцекла падчас застывання.

Так, як вы правільна здагадаліся, для вырабу самаробных крэйдачак патрэбны гіпс. А яшчэ акрылавыя фарбы і вада. Для таго, каб прыгатаваць каляровую масу, белы гіпсавы парашок трэба змяшаць з вадой (у прапорцыі 1:1,5 (то бок парашку больш, чым вады) і дадаць туды фарбу (колькасць залежыць ад таго, якое адценне і яркасць крэйды вы хочаце атрымаць). Можна мяшаць лыжкай, але хутчэй і весялей рукамі. Мы ў гэтым пераканаліся на ўласным досведзе. Выпэцкаліся з ног да галавы, затое шчасця колькі! Праўда, любавацца на свае рознакаляровыя рукі мы будзем пасля. Бо цяпер нельга губляць час. Хэлен нас папярэдзіла, што гіпс застывае вельмі хутка, прыблізна хвілін 8-15. А нам жа яшчэ трэба пераліць праз лейку атрыманую каляровую масу ў загадзя падрыхтаваныя формачкі. Каб крэйдачкі атрымаліся больш вясёлымі, палову цыліндра запаўнялі адным колерам, палову — іншым. Паводле слоў Хэлен, гэта вельмі зручна рабіць, калі на майстар-клас збіраецца шмат дзяцей. Усе замешваюць гіпс адначасова і пры гэтым выбіраюць сабе фарбу любімага колеру, а потым абменьваюцца. Крэйдачкі тады атрымліваюцца наогул вясёлкавымі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Пакуль наш рукатворны цуд сохне, мы п'ём гарбатку з печывам і дзелімся ўражаннямі. Разглядаем вырабы з гліны, якія зрабілі людзі на іншым майстар-класе — па керамікі. Праз хвілін дваццаць Хэлен бярэ ў рукі адзін з цыліндрыкаў, які ўжо практычна цвёрды, і прапануе нам дакрануцца. «Адчуваеце цяпло? Гэта ідзе хімічная рэакцыя з цеплавыдзяленнем».

Радасныя, мы забіраем гіганцкія крэйдачкі, зробленыя ўласнымі рукамі з сабой. Цяпер імі ўсё лета можна маляваць, пакуль асфальт не скончыцца! На развітанне Хэлен дае інструктаж: «Калі прыйдзеце дадому, вызваліце свае крэйдачкі з поліэтыленавага цыліндра. Занясіце на балкон і пакіньце іх там ляжаць яшчэ суткі, каб цалкам прасохлі.

Пры жаданні можна паспрабаваць зрабіць крэйдачкі і дома. Пры гэтым ад вас не патрабуецца мора часу, намаганняў і фінансавых выдаткаў. А дзіця, хутчэй за ўсё, з задавальненнем паўдзельнічае ў гэтым працэсе. Бо так прыемна гуляць з тым, што ты зрабіў сам.

А гульняў на асфальце — як дроў у лесе. Можна маляваць «класікі», альбо зладзіць конкурс сярод дзяцей у двары на самы арыгінальны малюнак. Прапануйце сваёй малечы пагуляць разам: вы малюеце, дапусцім, хмарку, а ён — кроплі дажджу. Гэта вельмі збліжае. Таксама можна маляваць дарогу і разметку на ёй, ці трасу са стартам і фінішам — гэта можна пасля скарыстаць падчас рухомых гульняў.

Дарэчы, самаробнымі крэйдачкамі можна маляваць не толькі на асфальце і не толькі летам. Фонам для дзіцячых малюнкаў могуць стаць нават сцены дзіцячага пакоя. Саша, напрыклад, расказала, што ім сябры падарылі чорную грыфельную дошку. Яна лёгка мацуецца да сцяны. І там Янка з Юстай з задавальненнем малююць таксама.

Надзея ДРЫЛА. *dryla@zviazda.by*

■

■ Маміны дзённікі

«А ВЫ НЕ ВЕРЫЛІ!»

Сын зламаў мне заколку для валасоў.

— Калі ты перастанеш псаваць рэчы? — разлавалася я.

— Калі вырасту.

☺☺☺

Укладваем Даню спаць. Пацалавалі і закрываем дзверы.

— Калі вы будзеце шумець, я да вас прыйду, — «пагразіў» сын.

☺☺☺

Муж прывёз сына да сябе на работу.

— Зараз дядзька Сяргей выйдзе, ты яму скажаш «прывітанне», — папярэджвае Даню.

— «Прывітанне» кажуць дзеці, а мужыкі кажуць «здарова!»

☺☺☺

Пасля навагодніх свят. Малы п'е ваду.

— За Вову! — падымае ўгору свой кубачак. — Каб ён не старэў!

☺☺☺

Зламалі бульбачыстку. Пачалася мітусня. Мужчыны наперабой раяць, як яе адраманаваць.

— Супакойцеся! — перакрыквае ўсіх Даня. — У нас ёсць сметніца!

☺☺☺

Калі бабуля і дзядуля ад'язджалі дадому пасля свята, Даня затрымаў іх у дзвярах:

— Стойце! Вы самы галоўны падарунак забылі, — і прынёс паштоўку, якую змайстраваў сам.

☺☺☺

Даня знайшоў пад ёлкай шмат падарункаў, але заўважыў там і падарункі для ўсіх дарослых.

— Бачыце, Дзед Мароз не толькі дзецям падарункі прыносіць, але і дарослым, а вы не верылі!

Занатавала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.

А пра што гавораць вашы дзеці? Дасылайце свае гісторыі.

■

АДЗІН ТАТА ЗНАЧЫЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ СТО НАСТАЎНІКАЎ (ДЖОРДЖ ГЕРБЕРТ).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Рэха фестывалю

«БЕЗ АЎЦЮКОЎ, ЯК ЦЕНЬ, ХАДЗІЎ Я Ў ВЕЧНАЙ СКРУСЕ...»

Здалёк: на дзень народзінаў вагу падарылі, у калідоры стаіць — на «раздарожжы». А таму, дзе быўшы, станеш і ўзважышся... Ці паверыце: перад ад'ездам на фестываль народнага гумару важыла 63 кілаграмы, пасля прыезду — 61 (з хвосцікам). За два дні амаль два кілаграмы! Без фізічных нагрузак, без ніякіх дыет... Ды гэта ж мара! А то і фантастыка, якую спраўдзіў, трэба разумець, звычайны смех?!

Пачаўся ён, як заўжды, па дарозе ў Калінкавічы, бо з сабой, па-першае, была кніга пісьменніка Уладзіміра Ліпскага і мастака Алега Карповіча «Тармазні над Аўцюкамі», а па-другое, сябры фестывальнага журы на хаду развучвалі новую песню Міколы Шабовіча з прыпевам:

Аўцюкоўцы, аўцюкоўцы,
Шчырыя мае вяскоўцы,
Каласкі мае, калінкі,
З вамі дні, як мёд!
А таму, шаноўны Ліпскі,
Ты пакінь свой клопат мінскі
І ўздымай хутчэй у неба
Гулкі верталёт.

Прычым тут верталёт? Ды на адным з папярэдніх фестываляў у Аўцюках і сапраўды адкрыўся аэрапорт, а напярэдадні вось гэтага, восьмага па ліку, і... суднаходны рух. Ва ўсякім разе, першы карабель (амфібія, бо ён яшчэ і на колах) ужо «тармазнуў» ля музея народнага гумару.

Удалае месца, бо пабудаваны музей каля бойкай шашы М-10 Гомель—Брэст па адмысловым праекце, з прыгожага дрэва, з любоўю. (Дарэчы, падчас адкрыцця з-за спіны гучала: «Вось бачыш — музей, а ты ўсё — царква ды царква...».) Храм... народнага гумару!

І пры ім — карчма «Ганарысты парсюк». Дарэчы, ён, запрэжаны ў павозку, нібыта імчыць там, над сталамі, у памяшканні. Знадворку ж...

Як тады, як некалі, як у найлепшых дамах беларусаў на сонейку сушыцца... кумпяк, прычым не абы які, а проста неабдымны, ад якога так і адкроіў бы скрылік — колькі б ні каштаваў...

Фота БЕЛТА.

Аднак пры блізкім разглядзе разумееш: траціцца, на жаль, не давядзецца, бо кумпяк той... з дрэва.

— У астатнім жа нідзе і ніякага падману, — смяецца Аляксандр Драгун, украінскі бізнесмен і ганаровы аўцюк, які пабудаваў гэты цуд пры дарозе. — У адрозненне ад іншых рэстаранаў у нас можа не быць нейкіх экзатычных ці дужа далікатных страў, але беларускія нацыянальныя ёсць заўсёды. Перад кухарамі, афіцыянткамі з першых дзён пастаўлена задача карміць людзей, як дома, — смачна, сытна, — і дзяўчаты вельмі стараюцца.

Можна, значыць, пад'есці, можна адпачыць.

Варта сказаць, што пляцоўка пры музеі народнага гумару павялічылася ў разы. У прыватнасці, з'явіўся яшчэ адзін цікавы турыстычны «аб'ект» — так званая лава прымірэння, уладкаваная так, што, толькі прысеўшы на яе, канфліктуючыя бакі хоць-нехаць «ідуць» на збліжэнне, пачынаюць хінуцца адзін да аднаго, пакуль урэшце не абнімуцца, не пацалуюцца і не памірацца! «Патрэбная рэч!» — прызналі аўцюкоўцы. І адкрывалі яе, як заўсёды, з помпаю (літаральна: гэта значыць, што быў у час адкрыцця і аглушальны «салют», і феерверк, і... вада з пажарных машын).

Мікалай ЗМУШКА, былы старшыня Малааўцюкоўскага сельскага Савета: *«Некалі ў нас быў адзін дзень, калі ў вёску з'язджаліся ўсе, хто выехаў. Гэта, вядома ж, Радаўніца. Цяпер людзі прыязджаюць на фестывалі народнага гумару, чакаюць іх, загадзя рыхтуюцца, прыбіраюць хаты, падворкі... Бо нельга ж жыць толькі сям'ёй ды працай. Людзям патрэбна свята».*

Але ж гэта потым. Спачатку прагучалі прывітальныя словы намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Прывалава, намесніка міністра культуры Васіля Чэрніка, старшыні Калінкавіцкага райвыканкама Івана Піліпца; на матацыклах, з эскортам, з розных бакоў пад'ехалі старшыні «варагуючых» Вялікааўцюкоўскага і Малааўцюкоўскага сельскіх Саветаў. На трактары, уся ў чырвоным, падкацілася рэферы — старшыня Сыродскага сельскага Савета... І быў нават бой, які скончыўся на той лаве...

Назаўтра свята перамясцілася «на асфальт» — на галоўную плошчу райцэнтра. Вяскоўцы, з якімі пашчасціла паразмаўляць, казалі, што гэта дужа дрэнна, што туды не даедзеш...

А *да* іх прыкладна тое ж казалі... гараджане.

Карацей, дагадзіць усім не атрымалася нават у Бога, што ўжо казаць пра людзей!

Факт, што ў абедзвюх фестывальных пляцовак ёсць багата як плюсоў, так і мінусаў. Але ж па сённяшнім часе лічаць не толькі іх, але і... грошы — на падвоз людзей, на арганізацыю гандлю, на бяспеку... У горадзе ўсе гэтыя пытанні вырашаюцца прасцей — тым больш, калі ведаць, колькі з'язджаецца народу. Ды адных гумарыстаў сем камандаў (з кожнай вобласці і горада Мінска!

Столькі ж сёлета было і намінацый, гэта значыць, што паміж сабой спаборнічалі тэатры мініяцюр, выканаўцы жартоўных песень і танцаў, анекдотчыкі, прыпевачнікі...

Апроч таго, у абавязковай праграме фестывалю былі інсцэніроўкі па творах адкрывальніка Аўцюкоў Уладзіміра Ліпскага і нават конкурс прыгажосці «Міс Аўцюкі-2016».

Забягаючы наперад, скажам, што здзіўлялі і радавалі многія гумарысты. Само сабой — гаспадары: народны тэатр народнага гумару «Вясёлыя аўцюкоўцы», само сабой — народныя жартоўныя калектывы «Дубінскія фанабэры» і «Тары-бары» з Міншчыны.

Цёпла прымалі гледачы (а іх — цэлая плошча!) выступленні тэатра «Люстэрка» з Гомельскага ўніверсітэта, драматычнага калектыву «Вандроўнікі» з Віцебска, ансамбля народнай песні «Шчадрэц» з Краснаполля, «Драгічынскага смехаўя»...

Але ж «фішкай» фестывалю стаў конкурс «Міс Аўцюкі».

На гэтае званне прэтэндавалі сем прыгажунь, прычым абсалютна розных — па росце, узросце, па сваіх, так бы мовіць, параметрах... Ад удзельніц ніхто не патрабаваў набіўшых аскому 90х60х90 — сантыметраў па грудзях, таліі і сцёгнах. Напэўна, таму яны і змаглі раскрыцца, паказаць сябе ў іншым і ва ўсёй красе.

Было, карацей, на што паглядзець і каго паслухаць! Журы, падводзячы вынікі, не на жарт паспрачалася, бо кароны — сапраўднай, залатой (адмыслова, па-майстэрску зробленай з такой жа залатой саломы) заслугоўвалі і Таццяна Трыбуналава з Мінска, і Вікторыя Чараповіч з Маладзечна, і Алена Мікуліч з Глуска, і, вядома ж, Алена Стальмашук з Драгічына! Як і Раіса Грыбовіч з Віцебска ды Вікторыя Хамчукова з Ваўкавыска...

І ўсё ж — шляхам абмеркавання ды галасавання — перамога была прысуджана хутчэй місіс, чым міс — маці траіх дзяцей Нэлі Засінец з Ельска...

Гэта былі дзеі з адной пляцоўкі, а ўсіх без малога... 20. І ўсе яны вабілі не менш — музыкай, прыпеўкамі, харастом, яркімі фарбамі і такімі ж пахамі. Прычым шчыравалі над іх «вытворчасцю» не толькі прадстаўнікі фірмаў гра-

Уладзімір РАДЗІВІЛАЎ: *«Я люблю прыязджаць і выступаць на гэтым фестывалі, мне цікава працаваць у журы, бачыць, як загараюцца новыя «зоркі», сачыць за імі...*

А наогул нашым аўцюкам, нашаму фестывалю пара ісці далей, пара выходзіць на міжнародную арэну! Яны варты гэтага... І, думаю, пойдуць!..

Уладзімір ЛІПСКІ, пісьменнік, старшыня журы: *«У мяне яшчэ з першых фестываляў ёсць мара — расшукаць у Беларусі ўсіх гумарыстаў. Ну ёсць жа, ёсць такія людзі! Мне вось шафер неяк кажа: «От, каб міліцыянер не падышоў, каб дзверцы ў машыне не адчыніў і каб я не вываліўся, то чорт бы ён здагадаўся, што я п'яны». Спачатку слухаеш — усё як быццам сур'ёзна, а потым... Мы смяемся, ён смяецца... І ўсім добра! Смех узвышае душу, ён, калі можна гэтак сказаць, раўняе спіны, прымушае паважаць чалавека ў чалавеку... І нас як нацыю.*

Яшчэ адна мара: хачу, каб была створана пастаянная дырэкцыя і каб яна працавала паміж фестывалямі, каб у краіне адкрылася кавярня з назвай, напрыклад, «Каласок і калінка». А што? Хай людзі прыходзяць, хай расказваюць тут анекдоты, хай слухаюць прыпеўкі, танцуюць пад гармонік... А ты, як той казаў, слухай не слухай, а брахаць не перашкаджай».

мадскага харчавання. Паказаць сябе была магчымасць ва ўсіх прадпрыемстваў. Вось яны і стараліся: афармлялі свае рэкламныя стэнды (цуд якая прадукцыя ў мясцовага хлебазавода, у зверагаспадаркі, у мэблевага камбіната... Не кажучы ўжо пра мясакамбінат...)

Загадзя «абжывалі» свае «пляцоўкі» і сельсаветы, каб тым самым паказаць гасцям усе мясцовыя таленты: ад бабуліных тканых посцілак, вышываных дываноў, сурвэтак — да музыкі, прыпевак, анекдотаў, да сталоў, якія літаральна прагіналіся пад талеркамі з рознай смакатой.

Што важна — грошай за яе тут, можна сказаць, не прасілі (хіба што жартам): частавалі задарма, а месцамі (па сакрэце) нават налівалі — на гарызантальны пальчык... І — па аўцюкоўскай традыцыі — спачатку сабе (бо раптам не хопіць).

А яшчэ там дэманстраваліся аўцюкоўскія вынаходкі ў выглядзе кішэннага млына, шапкі-невідзімкі, тачыла для нажоў, славутага бульбулятара (боты-скараходы нехта скраў). І шмат што прадавалі. Адна кабета — дык нават мужа, за 5 мільёнаў (у старых грашах). Казала, што ён дужа добры і дырэктарам працуе, але ж нейкім няправільным, бо іншыя начальнікі ўсё цягнуць у дом, а ён, наадварот, — з дому...

Трэба сказаць, што мужчына быў і сапраўды вельмі сімпатычны! І цікавы ж, але не купляў чамусьці ніхто: можа, баяліся жанкі, а можа, грошай пры сабе не мелі...

Што, дарэчы, і не дзіва, бо многія прыходзілі сюды пасля наведвання выстаўкі рамеснікаў і горада майстроў, дзе чаго толькі не было: прыгажэнныя плеценыя з лазы і кашолкі, саламяныя капелюшы, сувенірныя дамавічкі ды падкоўкі, вытканыя спецыяльна да свята ручнікі, сурвэткі...

— Жывыя нашы традыцыі, — расказвала к**іраўніца Акцябрскага раённага Дома рамёстваў Таццяна ХАЛАДОК.** — Мы ведаем нашых майстрых, стараемся падтрымаць іх, зацікавіць дзяцей ткацтвам, вышыўкай... Дзякаваць Богу, у апошні час гэта стала знаходзіць попыт. Наша Марыя Іванаўна Сарнаўская, напрыклад, на заказ тчэ імянныя вясельныя ручнікі, паясы. Карпатлівая гэта праца. Сядзіць, бывае, крукам — цэлы дзянёк... І так жа рада, калі гэта некаму трэба, калі падабаецца!

Наш чалавек, згадзіцеся!

...Іх, такіх вось простых, шчырых, дасціпных старых і малых было на фестывалі вялікае мноства! Да гонару: з Гомеля прыехаў на свята наш падпісчык Мікалай Старых, з Малых Аўцюкоў — Мікалай Горб, там жа сустрэліся з Валянцінай Крываносавай... Былі, напэўна, і іншыя чытачы «Звязды», але, на жаль, не аб'явіліся... Магчыма, стаялі ў чарзе да Аляксандра Каршакевіча з «Вожыка»: ён маляваў сяброўскія шаржы. А магчыма, затрымаліся на выставе рэтра-аўтамабіляў «Аўцюкоўскія тачкі» ці на стадыёне, дзе праходзілі амаль сапраўдныя Алімпійскія гульні — па футболе, па пінболе (гэта калі з рагатак вялікімі мячамі збіваюць кеглі), па гарадках, у якія і наогул цалялі ботамі...

